Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЖНІЎНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 154 (28264)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Пачынальнік спартыўнай журналістыкі?**
СТАР. 4



**Жыццё – як Алімпіяда**
СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Лілія КОВАЛЬ, віцэ-старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў:**

*«Колькасць жанчын на кіруючых пасадах у краіне пакуль невялікая. Напрыклад, у вытворчым сектары доля жанчын-кіраўнікоў складае 35%, у дырэктарскім корпусе — 6-8%. Не так шмат жанчын адважваюцца адкрыць свой бізнес — частка з іх сталі кіраўнікамі сямейнай справы, якую пачыналі іх бацькі або мужы. Патэнцыял прадпрымальніц выкарыстоўваецца неэфектыўна, у тым ліку з-за недастатковай колькасці праграм фінансавай дапамогі для жанчын у бізнесе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9648 | ▼ |
| Еўра | 2,1896 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0302 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0790 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# З рога ўсяго многа



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Народнаму майстру Беларусі па саломапляценні, самабытнай мастачцы Валянціне КІПЦЕНЦЫ прапанавалі пачэсную справу — падрыхтаваць сувеніры да Дня беларускага пісьменства. Сёлета эстафету святкавання прымае яе родны Рагачоў. А сімвал горада над Дняпром (і гэта замацавана на старажытным гербе) — рог на залатым фоне. Увесь свой працоўны і вольны час Валянціна Уладзіміраўна шчыруе з паслухмянай саломкай, праяўляючы сваё дасканалае майстэрства.**

■ Спажывец

## АЖЫЯТАЖ У АДДЗЕЛЕ БЯЛІЗНЫ

### Як праходзяць дні зніжак у сталічных універмагах

**Еўрапейскія гандлёвыя цэнтры вядомыя сваімі маштабнымі сезоннымі распродажамі і зніжкамі да 80 працэнтаў. Айчынныя прадаўцы пакуль не такія шчодрыя, але акцыі таксама практыкуюць. Так, асноўныя сталічныя ўнівермагі кожны месяц праводзяць «дні зніжак», у якія прапануюць набыць тавары на 15-20 працэнтаў танней, чым звычайна. На чым беларусы спрабуюць сэканоміць падчас такіх акцый? У дзень зніжак мы адправіліся ва ўнівермаг «Беларусь» і паспрабавалі даведацца пра гэта з першых вуснаў — ад саміх пакупнікоў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### Акцыі і пенсіянеры

Каля ўвахода ў краму жыццё кіпіць. Удачлівыя пакупнікі выходзяць з чатырма пакетамі, забітымі пад завязку, запасlівыя — заходзяць з дарожнай торбай, якая, калі што, шмат змесціць. Але шалёнага ажыятажу (як бывае падчас «чорных пятніц» ці на адкрыцці чарговага «Віталюра», натоўп перад дзвярыма якога збіраецца загадзя) не назіраецца.

У аддзеле электрапрыбораў ахвотных сэканоміць хапае. Яно і зразумела: па нашых падліках, прас сёння можна купіць танней у сярэднім на 12 рублёў, мікрахвалёўку — на 60 рублёў, халадзільнік — на 160.

— Слухай, я не ведаю, які тэлефон лепш узяць. Адзін такі чорны з вялікімі кнопкамі, другі шэры, больш прыгожы, але даражэйшы... А ты дакладна не можаш з работы адпрасіцца і пад'ехаць? — кансультацыя па мабільным ніяк не дапамагае пенсіянерцы вызначыцца з выбарам.

Сяброўкі Наталля і Ірына шукаюць электрачайнік. Здаецца, знайшлі падыходзячы варыянт — шэранькі, за 37 рублёў (з улікам зніжкі, у «Беларусі» гэта 20 працэнтаў, будзе каштаваць 30). Жанчыны расказваюць, што самі яны з Масквы, у Мінск прыехалі на пару дзён, у тым ліку і для шопінгу. А тут якраз акцыя!

— Хочам яшчэ ў адзенне зайсці. І абутак пагледзець, — дзяляцца планамі масквічкі.

СТАР. 3

## Тыдзень скончыцца лагодным надвор'ем

**Пахаладанне, якое прыйшло ўчора разам з дажджамі, будзе панаваць на тэрыторыі Беларусі прынамсі да канца тыдня. Пра гэта паведамілі ў Белгідраметцэнтры.**

Сёння месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер чакаецца паўночна-заходні, умераны. Паветра прагрэецца да плюс 16-22 градусаў.

У суботу днём на паўночны захад краіны з Балтыйскага мора змесціцца атмасферны фронт. Ён прынясе туды непрацяглыя дажджы. Тэмпература днём істотна не зменіцца, а вось ноч чакаецца ўжо па-верасnёўску халаднаватай: ад плюс 4 па поўначы да плюс 11 на поўдні краіны.

Крыху зменяцца ўмовы надвор'я ў нядзелю. З Расіі да нас завітаюць франтальныя падзелы ад цыклону. Дажджы ўдзень пройдуць ужо на большай частцы тэрыторыі, а ўначы чакаюцца месцамі. Крыху пацяплее: уначы будзе ўжо ад плюс 8 да плюс 15, удзень — ад 17 градусаў цяпла на поўначы да 26 на поўдні краіны.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**



# КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД

## Нашай краіне і Бранскай вобласці Расіі пад сілу актывізаваць узаемадзеянне па ключавых кірунках

**Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з губернатарам Бранскай вобласці Аляксандрам Багамазам.**

«Як мяне інфармавалі, за пяць месяцаў гэтага года тавараабарот прырос на 6%, але гэта мізэрныя паказчыкі. Я думаю, нам пад сілу выйсці на ўзровень тавараабароту, які быў у нас у 2013 годзе — больш за $900 млн», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што для нашай краіны Бранскі рэгіён — самы надзейны і вельмі важны партнёр.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што супрацоўніцтва з Бранскай вобласцю для Беларусі важнае і таму, што ў расійскім рэгіёне размешчаны вытворчасці «Гомсельмаша» і «Амкадора». «Я вельмі хацеў бы, каб гэтыя вытворчасці працавалі як прыклад нашага беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў цэлым. Паглядзіце за гэтымі прадпрыемствамі. Калі магчымая нейкая падтрымка ў плане іх паспяховага функцыянавання, дапамажыце. Калі нешта мы там павінны зрабіць, вы нам скажыце, мы абавязкова апэратыўна падключымся, каб больш шырока была прадстаўлена прадукцыя гэтых прадпрыемстваў не толькі на Браншчыне, але і ўвогуле ў Расіі», — заявіў беларускі лідар.

Яшчэ адным важным кірункам партнёрства з расійскім рэгіёнам, паводле слоў Прэзідэнта, можа стаць узаемадзеянне ў сельскагаспадарчай сферы. «Мы гатовыя з вамі дзяліцца ўсім, што ў нас ёсць, таму што мы суседзі, і мы вельмі зацікаўлены, каб Пскоўская, Смаленская і Бранская землі развіваліся інтэнсіўна — гэта і паказчык нашай уключанасці ў развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці Расійскай Федэрацыі, і паказчык таго, што мы можам зрабіць для расіян», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусі і Бранскай вобласці ад простага тавarнага абмену неабходна пераходзіць да больш глыбокага супрацоўніцтва, адзначыўшы, што без тавarнага абмену не абысціся, «але мы павінны і вырабляць тавар вельмі высокага ўзроўню для таго, каб разам маглі прадаваць не толькі на постсавецкай прасторы, але і ў краінах хоць бы Усходняй Еўропы».

У сувязі з гэтым было адзначана, што Беларусь і Бранская вобласць ствараць сумесны будаўнічы комплекс, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Бакі таксама плануюць развіваць супрацоўніцтва і ў сферы біятэхналогій.

Кіраўнік дзяржавы рэзюмаваў, што Беларусь гатовая комплексна падыходзіць да развіцця супрацоўніцтва з Бранскай вобласцю, каб гэта было выгадна для двух бакоў.

# «Ваенныя пенсіі» ўдасканаленыя

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №308 «Аб пенсійным забеспячэнні асобных катэгорый ваеннаслужачых».**

Дакумент накіраваны на павышэнне ўзроўню сацыяльнай абароны ваеннаслужачых, звольненых з ваеннай службы ў сувязі са скарачэннем колькасці Узброеных Сіл у 1992—1994 гадах. Тады пенсія ваеннаслужачым была прызначаная ў няпоўным памеры. Пры дасягненні агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, улічваючы невысокі памер атрыманай «ваеннай» пенсіі, большасць з іх разлічвалі перайсці на працоўную пенсію па ўзросце. Але ў сувязі з істотнымі зменамі ў пенсійным заканадаўстве ў 2015 годзе гэтыя пенсіянеры пазбавіліся такога права.

Указ устанаўлівае для гэтай катэгорыі грамадзян павелічэнне «ваеннай» пенсіі за кожны год работы (пасля назначэння ім пенсіі за выслугу гадоў) на 1% адпаведных сум грашовага забеспячэння, якія ўлічваюцца для вылічэння пенсій. Пры гэтым максімальны памер пенсіі для іх прапануецца ўстанавіць не больш за 70% улічваемага грашовага забеспячэння.




# Зжалі тры чвэрці пасяўных плошчаў

**У краіне ўжо сабрана з 73,6% пасяўных плошчаў збожжа. Па аператыўнай інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, аграрыі намалацілі больш за 5,6 млн тон збожжавых і зернебабовых культур пры сярэдняй ураджайнасці 34,5 ц/га.**

Як і раней, ва ўборачнай кампаніі лідзіруе Міншчына, дзе ўжо намалацілі больш за 1,5 млн тон. На другім месцы Брэсцкая вобласць, дзе аб'ём убранага збожжа складае 1,07 млн тон. На Брэстчыне ў Столінскім і Бярозаўскім раёнах ужо завяршылі ўборку. Там хлебаробы намалацілі 71,5 і 61 тыс. тон збожжа адпаведна. У найбліжэйшы час завершаць уборку збожжавых сельгаспрадпрыемствы Пружанскага, Іванаўскага, Івацэвіцкага, Ляхавіцкага і Маларыцкага раёнаў. Пры спрыяльных умовах надвор'я да іх неўзабаве далучацца і іншыя раёны. Лідарам вобласці па вале збожжа з'яўляецца Баранавіцкі раён. Там аграрыі сабралі больш за 122 тыс. тон, пры гэтым ім яшчэ трэба будзе ўбраць каля 15% плошчаў.

Тройку лідараў закрываюць аграрыі Гомельшчыны, якія сабралі 966,1 тыс. тон збожжа (там жніво таксама ўжо на фінішнай прамой).

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Выбары-2016

# «Гарачая пара» набліжаецца

**Акруговыя выбарчыя камісіі завяршылі рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Учора падчас размовы з карэспандэнтам «Звязды» старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА паведаміла, што звесткі аб рэгістрацыі кандыдатаў будуць прадстаўлены пасля таго, як завершаць працэс рэгістрацыі рэгіёны.**

## З «партыйнымі» працаваць прасцей

Старшыня Цэнтральнай камісіі звярнула ўвагу, што праверка дакументаў кандыдатаў, вылучаных ад партый, праходзіць хутчэй. У такім выпадку камісіям трэба толькі праверыць правільнасць дэкларацый аб даходах.

— Вылучэнне ад грамадзян шляхам збору подпісаў патрабуе нашмат больш складанай праверкі, бо гэта праверка подпісаў — плюс дэкларацыі, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Таму ўсе выбарчыя камісіі працуюць па сваім графіку. Мы ніколі не патрабуем нейкай справаздачнасці, не перашкаджаем працаваць нашым выбарчым камісіям. Яны нам тэлефануюць, каб пракансультавацца, у тым выпадку, калі ў іх ёсць пытанні.

У той жа час старшыня Цэнтрвыбаркама канстатавала: у Цэнтральную камісію ўжо паступала інфармацыя пра адмовы ў рэгістрацыі.

— Больш за тое, паступілі скаргі ў адпаведныя тэрытарыяльныя камісіі, — дадала Лідзія Ярмошына.

У цэлым жа, па яе словах, рэгістрацыя кандыдатаў — гэта працэс, які ўсюды розны.

## Чаго толькі не бывае

Цікаўлюся, чаму акруговыя камісіі адмаўляюць кандыдатам у рэгістрацыі.

— Была адмова ў сувязі з тым, што патэнцыяльны кандыдат парушаў закон у перыяд збору подпісаў і не рэагаваў на папярэджанні камісіі, якія яму выносілі двойчы, — праінфармавала Лідзія Ярмошына. — Была адмова ў сувязі з дэкларацыяй аб даходах і маёмасці.

Праўда, як патлумачыла Лідзія Міхайлаўна, у гэтым выпадку мела месца памылка — яе выправілі.

— Кандыдату адмовілі ў рэгістрацыі ў сувязі з тым, што ён не ўказаў наяўнасць у яго акцый, — расказвае старшыня Цэнтральнай камісіі. — А ў ходзе праверкі скаргі гэтага чалавека высветлілася, што гэтыя акцыі належаць яго поўнаму аднафамільцу — гэта значыць супадаюць прозвішча, імя, імя па бацьку. Такое таксама бывае.

Цяпер ужо вядома, што кандыдата зарэгістравалі. Быў яшчэ адзін кур'ёзны выпадак, калі кандыдат ад партыі занёс свае дакументы не ў тую камісію.

— Ёсць адмовы ў сувязі з тым, што подпісы з'яўляюцца яўна фіктыўнымі — у тым плане, што даюцца рэквізіты партый, якія ўжо не існуюць, — працягвае старшыня Цэнтрвыбаркама. — Відавочна, была выкарыстана нейкая жыллёвая база са старымі пашпартнымі звесткамі — да грамадзян жа прадстаўнікі ініцыятыўнай групы не прыходзілі. На жаль, ёсць і такое.

## Настрой добразычлівы

На гэтым тыдні нашу краіну наведала папярэдняя місія Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) па назіранні за маючымі адбыцца ў нашай краіне парламенцкімі выбарамі. Дэлегацыю ўзначаліла Гізела Вурм. Яна правяла сустрэчы ў шэрагу дзяржаўных і грамадскіх структур, у тым ліку і ў Цэнтральнай камісіі.

Лідзія Ярмошына паведаміла карэспандэнту «Звязды», што сустрэча была вельмі добразычлівай:

— Назіральнікі прыйшлі ўжо дастаткова падрыхтаванымі, яны сустракаліся з прадстаўнікамі грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, ужо атрымалі нейкую інфармацыю і задавалі самыя розныя пытанні: ад парадку вядзення перадвыбарнай агітацыі і праверкі падпісных лістоў да парадку падліку галасоў. Ім усё падрабязна тлумачылася, больш за тое, мы ім перадалі нашы метадычныя матэрыялы, якія былі распрацаваныя для выбарчых камісій. Яны сказалі, што на аснове гэтых матэрыялаў будзе падрыхтавана місія, якая прыедзе да нас на перыяд галасавання.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Факт

# Патруляванне — на матацыклах

**Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі Гродзеншчыны пачалі несці службу на патрульных матацыклах.**

Выкарыстоўваюцца матацыклы BMW са спецыяльнай патрульнай размалёўкай і амуніцыяй. Мотапатрулі будуць працаваць не толькі на гарадскіх вуліцах, але і на асноўных трасах вобласці, у месцах масавага адпачынку людзей, а таксама пры напружаных дарожных сітуацыях, напрыклад пры заторах. Дзякуючы большай, у параўнанні з аўтамабілем, манеўранасці і кампактнасці, мотатранспарт дазволіць больш аператыўна дабірацца да месцаў здарэнняў і змагацца з правапарушальнікамі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Сезон

# ПАЧЫНАЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ НА ПТУШЫНУЮ ДЗІЧЫНУ

**Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, з другой суботы жніўня, якая сёлета прыпадае на 13-е чысло, у краіне распачынаецца летне-восеньскі сезон палявання на вадаплаўную (апроч гусей) і балотную дзічыну, вальдшнэпа, вехіра, шызага голуба, перапёлку і фазана.**

З першай суботы верасня спіс дазволенай да здабычы птушынай дзічыны дапоўніцца рабчыкам і шэрай курапаткай, а з трэцяй суботы верасня гусямі — белалобым, гуменнікам, шэрым і канадскай казаркай. Сезон будзе доўжыцца да другой нядзелі снежня. Як бачым, пералік дазволенай да здабычы птушынай дзічыны даволі вялікі — ён уключае 25 відаў птушак. З іх асноўнымі аб'ектамі палявання з'яўляюцца крыжанка, чырок-траскунок, чырок-свістунок, чырванагаловая і чубатая чэрнеці, вяхір, шэрая курапатка і бакас. Паляванне на гусей у восеньскі перыяд менш папулярнае з-за асаблівасцяў восеньскага пралёту гэтых птушак.



Вылучаюцца разнастайнасцю і дазволеныя ў летне-восеньскім сезоне спосабы і прылады палявання. Здабываць дзічыну можна ў светлы час сутак наступнымі спосабамі: з засады, з падыходу, з пад'езду з выкарыстаннем маламерных суднаў (без рухавікоў або з выключанымі рухавікамі). Дазваляецца выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам, паляўнічых сабак усіх груп, за выключэннем ганчакоў і хартоў. Допускаецца бяззбройнае паляванне з выкарыстаннем ловчых птушак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



# Извещение о проведении 13 сентября 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе, инв. номер в ЕГРНИ)** | «производственный корпус № 1» общей площадью 3523 кв. м, инв. номер: 611/С-2660;<br>«производственное здание» общей площадью 3861,1 кв. м, инв. номер 611/С-9297;<br>«испытательная станция» общей площадью 440,9 кв. м, инв. номер: 611/С-10364;<br>«подстанция КТП» общей площадью 40 кв.м, инв. номер: 611/С-10368;<br>«хозпостройка» общей площадью 376,9 кв. м, инв. номер: 611/С-2659;<br>«открытый металлический навес с испытательными боксами» общей площадью 549,1 кв. м, инв. номер: 611/С-30483;<br>«сети хозяйственно-питьевого и противопожарного водопровода», инв. номер: 611/С-31529;<br>«сети тепловые», инв. номер: 611/С-31527;<br>«канализационные сети», инв. номер: 611/С-31528;<br>«сооружения очистные V=250 м³», инв. номер: 611/С-31526;<br>«сети слаботочные внутриплощадочные», инв. номер: 611/С-33332 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь: 4,7852 га;<br>кадастровый номер: 620450100001000588; |
| **Местонахождение** | Минская обл., Березинский р-н,<br>г. Березино, ул. Марии Романович, д. 21 |
| **Продавец имущества** | ОАО «НПО Центр»,<br>ул. Шаранговича, 19, ком. 304, 220018, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН»,<br>ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 2 683 500 бел. руб.<br>(26 835 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Сумма задатка** | 100 000 бел. руб.<br>(1 000 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Условие торгов (условие продажи)** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **13 сентября 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.08.2016 по 09.09.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017)259-05-54, (029) 686-45-13 (ОАО «НПО Центр»).**

■ Знаходка

# Ювелірны цэнтр каля Шуміліна

**На мінулым тыдні археалагічнай экспедыцыі выпала вялікае шанцаванне — на ШумілінШчыне быў адкрыты комплекс Кардон, на якім удалося знайсці ажно 600 прадметаў IX—X стагоддзяў: каля 50 дырхемаў, 30 гірак, ювелірныя шалі, гузікі, бранзалеты, пасавыя накладкі, нацельны крыжык скандынаўскага тыпу і ўсходнія пацеркі. Усе рэчы выразна сведчаць пра існаванне шляху «з варагаў у грэкі», які калісьці праходзіў праз гэту мясцовасць.**



Прадметы, якія пацвярджаюць, што шлях «з варагаў у грэкі» праходзіў праз ШумілінШчыну.

— Па значнасці і часавым перыядзе, да якога належыць комплекс, гэта адзін з некалькіх найважнейшых помнікаў археалогіі ва ўсёй Усходняй Еўропе. Яго аналагі — Гнёздава на Смаленшчыне ў Расіі і Шаставіца ва Украіне пад Чарнігавам. Цяпер і ў нас ёсць свой помнік таго даўняга перыяду — Кардон! — адзначыла **загадчыца Цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Вольга ЛЯЎКО**, якая ўзначальвае экспедыцыю ў Шумілінскім раёне. — Сляды гэтага часу мы шукалі доўга, сёе-тое траплялася на шматслойных помніках у межах ад VI да XIII стагоддзяў. А тут цэласны аб'ект IX-X стагоддзяў — у той перыяд сюды прыбылі варагі і аселі.

Бранзалеты і накладкі на паясы, матрыцы для адлівання ўпрыгажэнняў, тыгелькі, у якіх плавілі метал, — усе рэчы, знойдзеныя на раскопках, сведчаць пра стварэнне на гэтым месцы ювелірных вырабаў. Гіркі-разнавесы выраблялiся калісьці паўночнаеўрапейцамі і выкарыстоўваліся для ўзважвання каштоўных металаў.

Калі ўсе прадметы будуць ачышчаны, адшліваны і сфатаграфаваны, іх перададуць у краязнаўчы музей у Віцебск ці ў музей Акадэміі навук, у якіх забяспечаны неабходныя ўмовы для захоўвання такіх рэчаў. Навукоўцы пастараюцца захаваць калекцыю цэласнай.

Вольга Ляўко адзначае, што яны плануюць працягваць раскопкі ў Кардоне, на цяперашні момант гэта паселішча нумар адзін. Яно найбольш поўна раскрывае той перыяд, пра які менш за ўсё вядома ў Беларусі. Даследаванне паказвае, што Віцебскае Падзвінне, якое было самай важнай зонай пры фарміраванні шляху «з варагаў у грэкі», храналагічна апярэджвала расійскае Гнёздава, якое вывучалася штогод, пачынаючы з XIX стагоддзя.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** nina@zviazda.by

# АЖЫЯТАЖ У АДДЗЕЛЕ БЯЛІЗНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Зінаіда Аркадзеўна аб'яву пра зніжкі пачула ўчора па радыё. І прыйшла па халадзільнік.

— Не, гэта вялікі, — акідвае жанчына позіркам лядоўню вышынёй паўтара метра. — Што я ў ім захоўваць буду? Цяпер запасы на месяц наперад не робяць. Не ведаеце, ёсць меншыя?

Кансультанты ў аддзеле кажуць, што ў дні акцыі добра разыходзяцца свяцільні. А за зніжкамі больш за астатніх сочаць пенсіянеры, каб сэканоміць капейчыну (пасля дэнамінацыі — у прамым сэнсе) на лямпачках ці разетках.

## Сервіз для школы

Накіроўваемся ў секцыю посуду. Мяркуючы па звоне каструль і чэргах каля кас, гандаль ідзе на ўра. Дзве жанчыны разлічваюцца за вялікую партыю сервізу: кубкаў і талерак напакавалі на некалькі каробак. «Закупляем посуд для прыватнай установы адукацыі», — тлумачаць яны. У чэку — 320 рублёў. 80 удалося сэканоміць на іншыя патрэбы школы.

**Удачлівыя пакупнікі выходзяць з чатырма пакетамі, забітымі пад завязку, запаслівыя — заходзяць з дарожнай торбай, якая, калі што, шмат змесціць.**

Жанчын у краме сёння ўвогуле шмат. Асабліва ў аддзеле ніжняй бялізны. Чарга ў прымерачную — восем чалавек. І рухаецца вельмі павольна: дамы набралі карункавых камплектаў у абедзве рукі, бо разумеюць, што наступны шанц трапіць у прымерачную сёння выпадзе не хутка.

Большыя чэргі, бадай, толькі ў секцыі са школьнымі таварамі. Што не дзіўна. Калі ў звычайны дзень на касцюм, кашулю і чаравікі для хлопчыка пойдзе каля 180 рублёў, то сёння экіпіроўка абыдзецца рублёў у 140.

А вось у секцыі мужчынскага адзення, калі не лічыць некалькіх школьнікаў з мамамі, амаль пуста. Мужчын не цікавяць зніжкі?

— Ды не, што вы! — пераконваюць нас кансультанты. — Вось толькі нядаўна чэргі былі, ад вешалак да самых кас. Напэўна, перакусіць пайшлі.

Малады тата Валерый адзін з нямногіх прадстаўнікоў моцнага полу, якія блукаюць сярод паліц з абуткам. Прызнаецца, што насамрэч прыйшоў з жонкай шукаць форму для сына, але заадно вырашыў і для сябе што-небудзь нагледзець.

— Слухайце, вось у аддзеле касметыкі і бялізны да касы не прабіцца, а ў мужчынскіх секцыях — усяго па некалькі чалавек. Мужчыны не сочаць за акцыямі? — цікавімся ў Валерыя.

— Можа, мужчыны проста не такія модныя? — усміхаецца ён.

## «У зніжкі не веру»

На апошнім паверсе Марыя і яе дачка Святлана выбіраюць тканіну. Сям'я прыехала на шопінг з Вілейкі і на дзень зніжак трапіла выпадкова. Праўда, пакуль не вельмі ўдала.

— Я шукала сукенку, каб пайсці да сяброўкі на вяселле, але так нічога і не знайшла. Няма ў нас маладзёжнага адзення на 48-мы памер, — дзеліцца Святлана.

У выніку вырашылі пашыць сукенкі самі. Балазе мама Марыя — майстар у гэтай справе. Засталося толькі вызначыцца з колерам будучага ўбору: Святлана вагаецца паміж фуксіяй і марскай хваляй.

Галіна і яе муж Анатоль — мінчане. Ва ўнівермаг з суседняга мікрараёна яны прыехалі спецыяльна дзеля зніжак. Канкрэтнага спісу пакупак няма — проста зайшлі агледзецца.

— Мы ў цэнтральныя крамы ўвогуле рэдка ездзім, — кажа Галіна. — Звычайна побач з домам усё купляем.

Анатоль круціць у руках скураную сумку з цэннікам і прызнаецца, што ў зніжкі ён, калі шчыра, не надта верыць.

— Усё гэта маркетынгавыя хітрыкі, — упэўнены мужчына. — Памятаю, у адной краме дзверы ўваходныя глядзелі. Кошт стаяў — 600 рублёў. Праз пару дзён заходзім — напісана слова «акцыя», цана ў 740 рублёў зверху перакрэслена, а знізу тыя ж 600 рублёў. Вось вам і зніжка...

**За зніжкамі больш за астатніх сочаць пенсіянеры, каб сэканоміць капейчыну (пасля дэнамінацыі — у прамым сэнсе) на лямпачках ці разетках.**

Пакуль адны ставяцца да акцый скептычна, іншыя, што называецца, бяруць ад жыцця ўсё. Складваюць у кошык па пяць рамак для фотаздымкаў, набіраюць пакеты шкарпэтак (пры зніжцы ў 20 працэнтаў кожная пятая пара — бясплатная) і просяць запакаваць тэлевізар з большай дыяганаллю, чым планавалі спачатку (рублі за лішнія цалі быццам як з сэканомленых). Хоць грашыма, здаецца, ніхто асабліва не раскідваецца: не мае сэнсу сёння браць лядоўні ці пральныя машыны ў запас.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** lubneuskaya@zviazda.by

■ Трагедыі

# ДАЛЁКА АД ДОМА

## Пад Новасібірскам загінула сям'я з Пружанскага раёна

**Страшная аварыя пад Новасібірскам забрала жыцці чатырох жыхароў Брэстчыны, загінулі муж і жонка, іх сын і 9-гадовы ўнук. Як паведамілі інфармагенцтвы са спасылкай на расійскую Дзяржаўтаінспекцыю, беларускі аўтамабіль рухаўся па трасе Р254 з боку Омска ў бок Новасібірска. У нейкі момант ён выехаў на паласу сустрэчнага руху і ўрэзаўся ў вялікагрузную фуру. Удар быў такой сілы, што легкавік ператварыўся ў месіва, яго вадзіцель і пасажыры памерлі на месцы здарэння. Паводле адной з версій расійскіх праваахоўнікаў, беларускі вадзіцель заснуў за рулём.**

У машыне на момант аварыі знаходзіліся 58-гадовы жыхар вёскі Юндзілы (ён быў за рулём), яго 54-гадовая жонка, іх 32-гадовы сын і 9-гадовы ўнук — сын дачкі сужэнцаў, яна пражывае разам з бацькамі. Такім чынам, 30-гадовая жанчына страціла разам бацькоў, брата і адзінага сына.

— Аксана зараз у вельмі цяжкім псіхалагічным стане, — расказала карэспандэнту газеты **Ніна ПРАТАСЕВІЧ, спецыяліст Ружанскага пасялковага Савета.** — Суседзі, аднавяскоўцы стараюцца яе хоць неяк падтрымаць, але ж, самі разумееце, гэта складана.

Ніна Мікалаеўна да рэарганізацыі ўзначальвала сельсавет, у які ўваходзіла вёска, таму добра ведае гэту сям'ю. Паводле яе слоў, сям'ю можна назваць шчырымі, сумленнымі працаўнікамі і надзвычай прыстойнымі людзьмі. Галава сям'і Уладзімір Васільевіч больш за 20 гадоў працаваў галоўным аграномам гаспадаркі, якую пазней далучылі да ААТ «Ружаны-Агра». Цяпер у гэтым сельгаспрадпрыемстве працуе яго дачка Аксана. Жонка апошнім часам займалася асабістай гаспадаркай, у якой налічваецца толькі шэсць кароў. Сужэнцы выгадавалі чацвёра дзяцей.

Старэйшы сын ездзіў у заробкі ў Расію. Два гады таму ён загінуў пад Новасібірскам, там і быў пахаваны. І вось бацькі заказалі помнік тут, вырашылі яго завезці сваёй машынай і ўстанавіць на магіле сына.

Яшчэ ў пасялковым Савеце паведамілі, што дапамагчы прывезці на радзіму целы загінулых бярэцца сельгаспрадпрыемства «Ружаны-Агра». Дасягнутая дамоўленасць з адной з брэсцкіх арганізацый. Яе машына-рэфрыжэратар павінна выехаць 12 жніўня з Брэста ў Новасібірск. Упраўленне па працы і занятасці райвыканкама вырашае пытанне аб аказанні дапамогі на пахаванне сям'і.

...Уся вёска знаходзіцца ў шоку, — сказала Ніна Пратасевіч. Жанчыны цяпер прыгадваюць, як загінулая суседка расказвала, што ўвесь час сніўся сын і клікаў іх да сябе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** yackevich@zviazda.by

# ЗДАРЭННЕ НА ВОЗЕРЫ

**У Лагойскім раёне перавярнулася лодка: мужчына і дзяўчынка загінулі, хлопчык выратаваны.**

Было каля дзевяці гадзін вечара, калі ў МНС ад відавочцы паступіла паведамленне, што на возеры каля вёскі Завішына тонуць людзі. З яго слоў вынікала, што перавярнулася лодка, у якой знаходзіліся тры чалавекі: мужчына, хлопчык і дзяўчынка.

Да прыбыцця ратавальнікаў мясцовыя жыхары вынялі з вады і даставілі на бераг мужчыну, пенсіянера, які не падаваў прыкмет жыцця. Пазней фельчарам хуткай медыцынскай дапамогі была канстатавана яго смерць.

Работнікі МНС з выкарыстаннем спецыяльных сродкаў выратавалі хлопчыка 2007 года нараджэння, які знаходзіўся каля перавернутай лодкі на адлегласці 30 метраў ад берага. Пасля медыцынскага агляду дзіця дастаўлена па месцы жыхарства, яно не пацярпела, у шпіталізацыі патрэбы не было.

На адлегласці 25 метраў ад берага, дзе глыбіня складала 2,5 метра, ратавальнікі выявілі цела патанулай дзяўчынкі 2004 года нараджэння.

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, дакладную карціну таго, што адбылося, яшчэ трэба будзе высветліць, аднак, згодна з папярэдняй інфармацыяй, мужчына запрасіў дваіх суседскіх дзяцей пакатацца на драўлянай вёсельнай лодцы. Плаўсродак перавярнуўся, і дзяўчынка пачала тануць. Дарослы паспрабаваў яе выратаваць, і абодва сышлі пад ваду. Хлопчык застаўся на паверхні вады і трымаўся за перавернутую лодку.

Ратавальнікі МНС і АСВОДА нагадваюць: у лодцы або любым іншым маламерным судне неабходна быць у зашпіленай ратавальнай камізэльцы, якая зводзіць да мінімуму верагоднасць трагічнага зыходу ў выпадку перакульвання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

■ Ну і ну!

# У пасажыра падземкі канфіскавалі... шаблю

**Супрацоўнік службы бяспекі сталічнага метрапалітэна на станцыі «Плошча Перамогі» заўважыў у руках у пасажыра прадмет, падобны на шаблю. Ён спыніў грамадзяніна для дагляду і выклікаў міліцыянераў, што дзяжурылі на станцыі.**

Праваахоўнікі канфіскавалі шаблю ў ножнах і перадалі яе экспертам-крыміналістам, якім трэба будзе высветліць, ці з'яўляецца яна халоднай зброяй, а калі так, дык да якога віду, тыпу, узору адносіцца, паведамляецца на сайце ГУУС Мінгарвыканкама. Супрацоўнікамі УУС па ахове Мінскага метрапалітэна па гэтым факце праводзіцца праверка. Устаноўлена, што мужчына, у якога была канфіскавана падазроная рэч, займаецца рэстаўрацыяй прадметаў даўніны. Супрацоўнікі Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь ужо высветлілі, што зброя мае знешнія падабенства з кавалерыйскай салдацкай шабляй узору 1827 года, якая выкарыстоўвалася да 1917 года. Цяпер кошт гэтага віду халоднай зброі можа дасягаць некалькіх тысяч долараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

# ПАКУЛЬ БЕЗ МЕДАЛЁЎ

**На Алімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра сваё выступленні завяршылі беларускія веласіпедысты-шашэйнікі, гімнасты і некаторыя цяжкаатлеты, а вось баксёры працягваюць барацьбу за ўзнагароды.**

✓ Нашы веласіпедысты не змаглі заваяваць узнагароды ў Бразіліі. У жаночай шашэйнай індывідуальнай велагонцы з раздзельным стартам Алена Амялюсік стала толькі 11-й, у такім жа відзе мужчынскіх спаборніцтваў дзеючы чэмпіён свету Васіль Кірыенка заняў 17-е месца. Яшчэ адзін беларус Канстанцін Сіўцоў размясціўся на 25-м радку выніковага пратакола.

*— Спрабаваў знайсці свой рытм у гонцы, са старта не скажу што пачаў дрэнна, але не на той хуткасці ехаў, быў далёкі ад сваіх найлепшых вынікаў. Калі ў мінулым годзе да чэмпіянату свету падрыхтоўка складвалася ідэальна, то ў гэтым сезоне, на мой погляд, ехаў не з тымі разлікамі. Падчас сезона нават зашмат увагі надаваў падрыхтоўцы да гэтай гонкі ў Рыа,* — адзначыў пасля фінішу Васіль Кірыенка.



✓ Аляксандр Буйкевіч завяршыў выступленне ў асабістым турніры шаблістаў у паядынку 1/8 фіналу. Там яго сапернікам стаў чэмпіён Алімпійскіх гульняў 2012 года венгр Арон Шылагі. У пачатку паядынку Аляксандр Буйкевіч імкнуўся на роўных супрацьстаяць больш тытулаванаму атлету, пасляхова атакаваў і выйграў стартавы адрэзак — 8:7, але ў другой частцы сустрэчы не змог захаваць поспех.

✓ Цяжкаатлетка Дар'я Пачобут заняла шостае месца ў вагавай катэгорыі да 69 кг. У першым практыкаванні яна змагла зафіксаваць штангу вагой 105 кг і працягнула выступленне ў штуршку. Там усе тры спробы Дар'я зрабіла ўдала, падняўшы 132 кг, і завяршыла выступленне з сумай у дваябор'і — 237 кг.

Перамогу атрымала кітаянка Ксян Янмей з вынікам 261 кг.

✓ Дзмітрый Асанаў выйшаў у 1/8 фіналу алімпійскага турніру па боксе ў вагавай катэгорыі да 56 кг. У першым баі на алімпійскім рынгу беларус сустракаўся з сапернікам з Дамініканскай Рэспублікі Эктарам Гарсія Мора, а наступны паядынак Дзмітрый правядзе з Цэндбаатарам Эрдэнэбатам з Манголіі. Сустрэча адбудзецца 14 жніўня.

Сёння барацьбу за ўзнагароды ў вагавай катэгорыі да 81 кг працягне яшчэ адзін беларус Міхаіл Даўгалевец. Яго сапернікам стане сярэбраны прызёр лонданскіх Гульняў-2012 Адзільбек Ніязымбетаў з Казахстана.

✓ Лідар зборнай па плаванні Аляксандра Герасіменя не выйшла ў фінал Алімпіяды на дыстанцыі 100 м вольным стылем. У паўфінальным заплыве яна фінішавала з вынікам горшым, чым у папярэднім раўндзе. У Рыа Аляксандра яшчэ будзе выступаць на дыстанцыі 50 м вольным стылем.

■ Гучныя імёны

# ПЕРШЫ НА АЛІМПЕ

## Як наш зямляк стаў нацыянальным героем Грэцыі, і ці быў ён родапачынальнікам спартыўнай журналістыкі?

**Імя Зыгмунта Мінейкі сёння вядомае не толькі беларусам, але і ўсяму свету. Гэты таленавіты чалавек нарадзіўся ў 1840 годзе ў невялікім мястэчку Балвашнікі, што на Ашмяншчыне (цяпер вёска называецца Зялёны Бор). Яго жыццё пачалося ў шляхецкай сям'і, а вучыўся Зыгмунт у найлепшых навучальных установах таго часу. Спачатку Мінейка быў навучэнцам Віленскай гімназіі (дарэчы, разам з яшчэ адным не менш вядомым чалавекам — Францішкам Багушэвічам), потым — Інжынернага вучылішча ў Санкт-Пецярбургу, а затым — ваеннай школы ў Генуі, заснаванай знакамітым Гарыбальдзі.**

### Ваенная сцежка

У часы паўстання пад кіраўніцтвам Каліноўскага Зыгмунт Мінейка быў камандзірам атрада паўстанцаў Ашмянскага павета. А пасля паражэння яго асудзілі да пакарання смерцю. Праўда, удалося падкупіць аднаго чыноўніка, і павешанне замянілі катаргай. Але ў жыцці Зыгмунта Мінейкі было столькі невыпадковых выпадковасцяў, што нават стамляешся здзіўляцца. На дарозе ў Сібір памірае яго таварыш, і з чужымі дакументамі Мінейка ўладкоўваецца ў Томску, адкуль пазней нечакана збягае. У выніку беларус апынаецца ў Францыі, дзе заканчвае Акадэмію генеральнага штаба французскай арміі.



Мармуровы стадыён.

### Таленавіты ва ўсім

У сярэдзіне 70-х гадоў XIX стагоддзя Мінейка перабіраецца ў Грэцыю і пачынае новы вектар сваёй дзейнасці. Дакладней — прыступае да раскопак легендарнага храма Зеўса ў Дадоне. Спробы знайсці гэты каштоўны гістарычны аб'ект археолагі рабілі на працягу двухсот гадоў, але ўсё было безвыніковым. Інжынерныя веды дазволілі Зыгмунту Мінейку вызначыць месца, дзе трэба шукаць храм, і ў выніку ён зрабіў сенсацыйнае археалагічнае адкрыццё — тут да беларуса і прыйшла сусветная слава.



У Грэцыі наш суайчыннік працаваў галоўным інжынерам правінцый Эпір і Фесалія, будаваў жалезныя дарогі і масты, узначальваў Дэпартамент грамадскіх работ у Афінах. А калі краіна рыхтавалася прымаць першыя адраджаныя Алімпійскія гульні ў 1896 годзе, Мінейка ўзначаліў рэстаўрацыю алімпійскага Панацінаікоса — старажытнагрэчаскага Мармуровага стадыёна. Беларус працаваў і над узвядзеннем іншых спартыўных аб'ектаў да Гульняў. Але гэтым яго ўдзел у першай Алімпіядзе не абмяжоўваўся. На Гульнях Мінейка адкрыў яшчэ адну грань свайго таленту — публіцыстычную.

### Першы спартыўны журналіст?

На некаторых звестках, Зыгмунт Мінейка з Афінаў пісаў маляўнічыя, захапляльныя рэпартажы адразу ў некалькі газет: кракаўскі «Час», «Дзённік польскі», «Львоўскую газету». Калі гэтая інфармацыя сапраўдная, то, па сутнасці, менавіта беларус стаў родапачынальнікам спартыўнай журналістыкі і першым беларускім рэпарцёрам, які працаваў на Алімпійскіх гульнях. Крыніцы, у якіх Мінейка называецца першым спартыўным публіцыстам, кажуць, што Алімпіяду ў сваіх артыкулах ён называў «цудам у Афінах». Адзін з герояў публікацый Мінейкі — індыйскі спартсмен Бхандзі Лакшмі, які выступаў за брытанскую Індыю (дарэчы, атлет памёр толькі ў 2000-м, у 124 гады).

### Дзеці і ўнукі як працяг генія

У 1910 годзе пытанне пра ўнёсак Зыгмунта Мінейкі ў развіццё эканомікі, культуры, стварэння ўзброеных сіл было вынесена на абмеркаванне грэчаскага парламента. Унікальны выпадак — у знак прызнання выбітных заслуг перад краінай парламент прысвоіў іншаземцу званне ганаровага грамадзяніна Грэцыі.

Зыгмунт дачакаўся з'яўлення на свет у 1919 годзе ўнука Андрэаса (ад шлюбу яго дачкі Сафіі з Георгіясам Папандрэу). Гэтаму хлопчыку таксама была наканавана вялікая будучыня. Андрэас Папандрэу быў прэм'ер-міністрам Грэцыі ў 1981—1989 і 1993—1996 гадах.

На схіле жыцця Мінейка двойчы бываў у родных мясцінах. У 1911-м ён наведаў Балванішкі, Ашмяны, Гальшаны, Вільню. Праз 10 гадоў прыехаў у Ашмяны, каб развітацца з роднай зямлёй, калі яму ўжо было за 80. Кажуць, што перш за ўсё, калі ён прыехаў у Ашмяны, Зыгмунт стаў на калені і пацалаваў родную зямлю.

У 1925 годзе Зыгмунт Мінейка памёр у Афінах, праводзіць яго ў апошні шлях прыехалі тысячы людзей з многіх краін.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

### У тэму

***Пра Зыгмунта Мінейку нам расказаў гісторык, публіцыст, вядомы беларускі даследчык прафесар Адам МАЛЬДЗІС:***

*— У сваіх успамінах, якія называюцца «Ад тайгі да Акропаля» Мінейка піша пра час ад 1848-га па 1866 год. Гэты том быў напісаны ў апошнія гады яго жыцця. Зыгмунт Мінейка — асоба ўнікальная, выключная, адзін з нашых выдатных суайчыннікаў, якім мы абавязаны ганарыцца. Ён сапраўды працаваў у Міністэрстве грамадскіх работ, кіраваў дэпартаментам, які адказваў за аднаўленне стадыёна, дзе прайшлі Алімпійскія гульні 1896 года. Ці пісаў сам ён пра гэта — такіх звестак ва ўспамінах няма. Магчыма, Зыгмунт даваў некаторыя каментарыі, інтэрв'ю накont будаўніцтва спартыўных арэн. У першую чаргу ён быў будаўніком, інжынерам. Такім чынам, вядома, беларус быў вельмі блізкі да такой падзеі, як пачатак алімпійскага руху, які сёння працягваецца ў Рыа-дэ-Жанэйра. Цудоўна, што мы, беларусы, у час Алімпіяды ўспамінаем пра нашага суайчынніка. Лічу, што і ў Бразіліі таксама мусяць успомніць Мінейку ў пачатковым ці заключным слове.*

**Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ:**

# «УЛАДЗІМІР САМСОНАЎ — САПРАЎДНЫ БАЕЦ!»



**Напярэдадні адлёту ў алімпійскі Рыа-дэ-Жанэйра Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, дэпутат і старшыня Федэрацыі лёгкай атлетыкі, падзяліўся са «Звяздой» уражаннямі ад Алімпіяды.**

**— Вадзім Анатолевіч, у якім аб'ёме сочыце за Алімпіядай?**

— У жывым эфіры ўсё глядзець складана. У запісе праглядаю ключавыя моманты спаборніцтваў. Калі выступаюць беларусы, сачу за навінамі ў рэжыме анлайн. Многіх спартсменаў ведаю асабіста. Падтрымліваю кожнага.

**— Хто на гэты момант вас найбольш уразіў з беларусаў?**

— Я вельмі ўсцешаны за Уладзіміра Самсонава. Ведаю яго як сапраўднага байца, чалавека, які вельмі захапленне. Ён — спалучэнне чалавечнасці і прафесіяналізму. Павերце, не кожны дзень гэта можна ўбачыць. І я ўдвайне рады за Валодзю, што ён здолеў упершыню выйсці ў паўфінал Алімпіяды ў спаборніцтвах па настольным тэнісе.

**— Ён у чвэрцьфінале атрымаў траўму, але ўсё роўна давёў паядынак да перамогі. Памятаеце, калі самому прыходзілася кідаць молат праз боль?**

— У апошнія гады кар'еры кідаў толькі праз боль. Адзін з маіх вершаў завяршаецца наступнымі радкамі: «И пот, и слёзы, боль и стон/ Все это было не напрасно/ Всему виною только он/ О, спорт, ты жизнь, а жизнь прекрасна!» Хацеў гэтымі радкамі сказаць аб тым, праз што прыходзіцца прайсці спартсмену. Імгненню, калі ты ўзыходзіш на п'едэстал, папярэднічаюць дзясяткі гадоў пякельнай працы. Ты ахвяруеш здароўем, часам асабістым жыццём... Усё падпарадкоўваецца спорту. І калі чагосьці дасягаеш, разумееш, зроблена гэта было недарэмна. Спорт — неад'емная частка жыцця. Філасофія. Без яго не можаш жыць.

**— Раней вы ляталі на Алімпіяду як удзельнік. А цяпер чым будзеце займацца на Гульнях?**

— Найперш лячу ў Бразілію, каб падтрымаць нашу зборную па лёгкай атлетыцы. Кожнага спартсмена я ведаю асабіста. Уяўляю іх магчымасці. Апошнія некалькі гадоў мы былі разам, і зараз мне хочацца падтрымаць іх маральна.

Акрамя таго, збіраюся пагутарыць з чыноўнікамі Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі. Ёсць магчымасць заключыць важнае пагадненне. Выдаваць яго змест пакуль не буду. Але станоўчы вынік дасць нашай лёгкай атлетыцы другое дыханне.

**— Вы ж пастаянна з сувязі з лёгкаатлетамі. На што яны наракаюць? Чым незадаволеныя?**

— Усё нармальна. Хоць невялічкі дыскамфорт у бытавым складніку прысутнічае, але нашы не скардзяцца. Навошта на падобных рэчах губляць энергію? Яны настроены на спартыўную барацьбу. І я ўсцешаны, што яны не распыляюцца, падыходзяць да гэтага па-філасофску.

**— За кім будзеце сачыць асаблівым чынам?**

— За ўсімі. Зразумела, кіданне молата я разумею лепш, але ўсе лёгкаатлеты будуць пад маёй увагай. Кожны з іх пераследуе свае задачы. І я хачу ўбачыць, як яны будуць з імі спраўляцца. Хтосьці паехаў у Рыа з прыцэлам на наступную Алімпіяду, а нехта хоча ляпнуць дзвярыма на развітанне...

**— Як малатабоец Іван Ціхан?**

— На нядаўнім чэмпіянаце Еўропы ў Амстэрдаме ён заваяваў сярэбраны медаль і ўжо даказаў, што і ў сорак гадоў з'яўляецца спартсменам сусветнага ўзроўню.

**— Ягоны рэкорд — 84,51 м. А ці можа ён зараз наблізіцца да яго?**

— На чэмпіянаце краіны Іван кінуў молат за 80 метраў. Сёння толькі два малатабойцы пераадольваюць гэтую планку — ён і паляк Файдэк.

**— Дарэчы, Павел Файдэк адзначыўся тым, што не паціснуў руку Ціхану на п'едэстале ў Амстэрдаме. Абгрунтоўвае гэта старым допінгавым скандалам Івана.**

— Няхай гэта будзе на яго сумленні. Я не хачу абвастраць сітуацыю. Іван для сябе пэўныя высновы зрабіў. Але такое прысутнічае не толькі ў лёгкай атлетыцы. Вы ж бачыце, як ставяцца да расійскіх спартсменаў. Што тычыцца палякаў, з імі ў нас заўжды былі добрыя стасункі. Мы сябравалі, разам трэніраваліся. І ніякіх праблем не было.

**— Калі самі былі спартсменам, вам пастаянна ставілі медальныя задачы...**

— На мяне таксама спадзяваліся. І я ўсцешаны, што спраўляўся з гэтым ціскам, прывозіў медалі.

**— А цяпер вам ужо самому прыйшлося складаць план.**

— Так. У любым выпадку хочацца бачыць у камандзе атлетаў, якія будуць заваёўваць медалі. І ў нашай камандзе ёсць шэраг спартсменаў, якія могуць змагацца за ўзнагароды.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

TV@R

# ДОЎГІЯ ГУТАРКІ ПРА ТВОРЧАСЦЬ,

## або Закулiссе «Дыя@блогу пра лiтаратуру»

**Колькі гадоў таму пісьменніца, журналістка і тэлевядучая Стэла Чыркова разам з сям'ёй змяніла тлумнае і вірлівае жыццё ў Маскве на больш спакойны і бяспечны Мінск. І сёння твар Стэлы, бадай, пазнаюць многія жыхары нашай краіны: разам з Таццянай Сівец яна з'яўляецца вядучай праграмы «Дыя@блог пра літаратуру» на канале «Беларусь 3» і прадстаўляе рускамоўны бок гэтага тэледыялогу пра паэзію, прозу, пераклады. Яна сама піша кнігі ў жанры сямейнай сагі, шмат падарожнічае па свеце, а таксама выхоўвае дзвюх чароўных дачок. Пра адметнасці працы ў праграме, любімыя маршруты вандровак па Беларусі і прыхільнасць да сукенак айчыннай вытворчасці — наша гутарка са Стэлай.**



У студыі «Дыя@блогу».

***— Паколькі «Дыя@блог пра літаратуру» шмат у чым грунтуецца на пытаннях і каментарах гледачоў, то пачну з глядацкага водгуку пра двухмоўны фармат праграмы. Чула меркаванне, што ўзнікае пэўная блытаніна ва ўспрыманні, калі гучаць адначасова беларуская і руская мовы. Як вам самой, камфортна працаваць у такіх умовах?***

— Я ўжо прывыкла. У праграме я пачала працаваць літаральна адразу пасля таго, як пераехала жыць з Масквы ў Мінск. Да гэтага часу я беларускай мовы амаль што нідзе не чула. Першы час мне было дзіўна, але вельмі цікава. Дзе яшчэ пачуеш столькі беларускага маўлення? На вуліцах Мінска мова не так і часта гучыць. Але што да гледачоў, то я чула больш пазітыўных водгукаў. Бо госці ў нас розныя, і калі б праграма была на адной мове, толькі беларускамоўным ці выключна рускамоўным гасцям было б складана. Двухмоўны фармат дае прымірэнне. У выпадку, калі ў нас некалькі здымкаў запар, то стараемся падбіраць гасцей, якіх ужо запрашалі раней і чыталі, каб не ўваходзіць адразу ў чужую тэму, не знаёміцца з цалкам невядомым творцам.

***— Неяк вы з сувядучай Таццянай Сівец дамовіліся пра тое, што ўсе касцюмы, у якіх вы выступаеце ў праграме, мусяць быць выключна беларускай вытворчасці. Усё яшчэ кіруецеся гэтым правілам?***

— Першыя два гады мы трымаліся, нават было невялікае спаборніцтва ў тым, у каго больш беларускіх рэчаў у гардэробе. Але потым здаліся, чаму — не памятаю. Можа, Таня знайшла нейкую небеларускую фірму, якая робіць вельмі прыгожыя сукенкі, і мне таксама стала не прынцыпова. Але я вельмі люблю сукенкі, якія шыюць беларускія дызайнеры, а ў праграме мы здымаемся ў асноўным у сукенках.

***— Многа даводзіцца грошай траціць на гардэроб, каб выглядаць увесь час добра, з'яўляцца ў кадры ў новых прыгожых вобразах?***

— Не, бо сукенкі ад беларускіх вытворцаў не надта дарагія.

***— А з Таццянай Сівец ужо пасябравалі, знайшлі ўзаемаразуменне?***

— Два журналісты — як два крумкачы: калі вочы адзін аднаму не выдзёўбваюць, па азначэнні сябры *(смяецца)*. А калі сур'ёзна, то перадачу рабіць трэба, выручаць адна адну трэба, бо апроч сумеснай працы ў «Дыя@блогу» мы маем і асноўныя заняткі, зусім іншыя. Натуральна, працу адна за адну мы не робім, але агульныя тэхнічныя моманты часам вырашаем па чарзе.

***— Пытанні гледачоў, каментары, што вы зачытваеце падчас праграм, — рэальныя, ці часам вы іх самі прыдумваеце?***

— На ўсе 100% рэальныя. Спачатку ў нас гэта нават правяралі. Не тое, што мы спрабавалі некага падмануць, у любым выпадку заўсёды прасцей браць «жывыя пытанні». Колькі я магу пытанняў прыдумаць для кожнага пісьменніка? Толькі тыя, што ў мяне самой узнікаюць. Як паказвае практыка, пытанні гледачоў зусім не такія і не пра тое, пра што хацела б запытацца я. Гледачоў вельмі мала цікавіць сюжэт, фабула, натхненне, тэхніка напісання. Іх у цэлым цікавяць толькі тры рэчы: хто чытач кнігі, пра якую ідзе гаворка, — жанчына ці мужчына? Як выдаюць, рэкламуюць кнігі і колькі за гэта плацяць? А калі да нас завітваюць выдаўцы, то часта пытаюцца, як да іх можна трапіць.

***— Праца з гледачамі, публікай патрабуе шмат сіл і часу. Калі апрацоўваеце каментары ў сацыяльных сетках, ведзяце дыялогі з чытачамі, не маеце адчування, што гэтая праца крадзе асабісты час?***

— На любімую тэму можна гутарыць нават не ў працоўны час. Ды і пра літаратуру я магу гаварыць доўга. Менавіта таму мае сэнс весці толькі тую праграму, тэма якой табе асабіста вельмі цікавая. Мне самой цікава, якія пытанні задаюць, што кажуць гледачы.

***— Вопыт камунікацыі з героямі праграм, тое, што яны распавядаюць, вам асабіста таксама карысна ў працы?***

— А дзе яшчэ я з імі пазнаёмлюся? Не буду ж сама навязвацца, пісаць у інтэрнэце знакамітым празаікам, выдаўцам, паэтам, крытыкам і запрашаць на каву, каб пагутарыць, бо мне гэта цікава. Атрымліваецца, што і нам цікава, і нашым гасцям таксама цікава з намі. Мне гэтая праграма столькі людзей з літаратурнага кола падарыла, колькі я сама за жыццё не сустрэла б!

***— Вы шмат падарожнічаеце, неяк нават называлі фантастычную лічбу наведаных краін...***

— Сёлета правяла адпачынак у 44-й.

***— Якія далейшыя планы па вывучэнні свету?***

— Трэба падумаць. Хутчэй за ўсё, я зноў паеду ў Індыю, туды ў лістападзе клічуць на вяселле. Але гэта будзе паўтор, мы там ужо былі. Што да новых, то нават і не ведаю, планы падарожжаў ніколі не здзяйсняюцца. Адзіны раз, калі я паехала, куды планавала, быў сёлета, калі «Белавія» праводзіла акцыю да 20-годдзя. Звычайна, калі выпадае адпачынак, гляджу на тое, куды квіткі ёсць, туды і выпраўляюся.

***— Вы досыць актыўна вандруеце па Беларусі. Як ацэньваеце айчынны сэрвіс для турыстаў?***

— Такое ўражанне, што вобласці і раёны — як розныя краіны. У адну мясцовасць прыязджаеш — усё выдатна, і сэрвіс, і ўказальнікі для турыстаў, арганізавана харчаванне, выдатныя экскурсіі ў музеях, шмат паслуг, людзі прыветныя. А трапляеш у суседні раён — там фармальна ў спісе ўсё ёсць, але ў рэальнасці і паглядзець няма на што.

***— Давайце адмоўныя прыклады згадваць не будзем, а ўспомнім станоўчыя. Куды параілі б паехаць госцю Беларусі?***

— У нас заўсёды многа гасцей, і я ўвесь час нешта ім раю, таму ведаю правераныя маршруты. Акрамя Мінска, заўсёды раю Мір, Нясвіж, Навагрудак, бо там можна пабачыць замкі; тых, у каго больш часу, выпраўляю ў Брэст, дзе можна наведаць крэпасць, выдатныя музеі і завітаць у Белавежскую пушчу, у Брэсцкай вобласці цікава таксама паглядзець Косаўскі замак на Івацэвіччыне і сядзібу Тадэвуша Касцюшкі. Вельмі люблю Гомельскую вобласць, таму і сяброў агітую выправіцца туды.

***— Вы ж яшчэ і кнігі пішаце ў жанры сямейнай сагі.***

— Іх я не паспяваю пісаць *(смяецца)*. Раней у мяне была дамова з расійскім выдавецтвам, тады кожныя чатыры месяцы трэба было здаваць рукапісы рэдактару, выконваць план і адпрацоўваць аванс. У такіх умовах, натуральна, усё паспявала. Але беларускія выдаўцы ненавязлівыя, рукапісаў не патрабуюць, таму і не паспяваю пісаць.

***— Хвалюецеся, як кнігу ўспрымуць чытачы?***

— Ужо, напэўна, не. Я прывыкла працаваць у плыні, калі праз пэўны перыяд часу трэба здаваць новую кнігу. Атрымліваецца, пакуль папярэдняе выданне даходзіць да чытача, я ўжо пішу новы твор, у мяне ўжо новыя героі жывыя, я перажываю за іх. Пра папярэдні раман нават не думаю.

***— Ці можа пісьменнік працаваць не па натхненні, а па вось такім плане?***

— Як журналіст, прывыкла да планавання. Я ўсё жыццё працую так. Нават не ведаю, ці можна па-іншаму. Калі не ведаеш, па якім плане будзеш працаваць, то як даведацца, калі прачнуцца зраніцы? Што дакладна я зраблю? Як гэта ацаніць? Я так не ўмею. Штодзень ведаю, колькі і што буду рабіць, як ацаню зробленае.

***— Акрамя таго, што вы паспяховая пісьменніца, вядучая, вы яшчэ і мама дзвюх дачок. Якая вы мама — строгая, добрая?***

— Я вясёлая мама. Прытрымліваюся меркавання, што з дзецьмі павінна быць весела і ўвогуле нараджаць дзяцей мае сэнс толькі ў тым выпадку, калі табе з імі весялей, чым без іх. Мне з маімі дзецьмі весялей, чым без іх, спадзяюся, ім са мной таксама.

**«Прытрымліваюся меркавання, што з дзецьмі павінна быць весела і ўвогуле нараджаць дзяцей мае сэнс толькі ў тым выпадку, калі табе з імі весялей, чым без іх»**

**«Як паказвае практыка, пытанні гледачоў зусім не пра тое, пра што хацела б запытацца я»**

З каляжанкай па эфіры Таццянай СІВЕЦ і дзіцячай пісьменніцай Наталляй БУЧЫНСКАЙ.




**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# Смех скрозь слёзы — і наадварот

**Што: камедыя «Цацка»**
**Калі і дзе: «8 канал», 15 жніўня, 07.20 і 15.00**



Дадзена: адзін амаль што беспрацоўны супрацоўнік газеты, адзін, мякка кажучы, нябедны магнат і адзін самотны хлопчык. Пытанне: што атрымаецца, калі звесці іх у адзін не самы цудоўны момант у адным месцы? Правільны адказ — камедыя.

Выдатная музыка, спалучэнне камічнага і сумнага, фірменнае крыху нязграбнае і сарамлівае абаянне П'ера Рышара, нарэшце, вечная праблема бацькоў і дзяцей на прыкладзе сям'і мільянераў (дарэчы, для 10-гадовага Фабрыса Грэка роля «залатога хлопчыка» Эрыка ў гэтым фільме стала першай і адзінай у кіно) — словам, камедыі Франсіса Вебера наканавана было стаць папулярнай і актуальнай на доўгі час. Фільму сёлета спаўняецца 40 гадоў, а ён па-ранейшаму збірае ля экранаў мноства неабыякавых гледачоў. Нават калі вы раней ніколі не бачылі «Цацку», але не па чутках ведаеце, як цяжка бывае з дзецьмі, — паглядзіце гэты фільм, лепш нават разам з імі.

**Што: меладрама «Ой, ма-мачкі!»**
**Калі і дзе: «Беларусь 1», 20 жніўня, 12.50 і 15.45**



Тым з'едлівым крытыкам кінастудыі «Беларусьфільм», якія сумняваюцца ў здольнасці «нашых» здымаць сучаснае кіно, варта паглядзець хоць бы гэты фільм, зняты рэжысёрам Іванам Паўлавым у 2013 годзе.

Праўда, папярэджваем: «Ой, ма-мач-кі!» — не 2-гадзінная кінакарціна, а ажно 12-серыйны тэлефільм, што паказвае будні гарадской радзільні. Дапамагаць будучым маці хутчэй сустрэцца са сваімі доўгачаканымі немаўлятамі — справа адказная і няпростая. А калі дадаць непазбежныя форс-мажоры, розныя жыццёвыя абставіны і характары парадзіх, спецыфічны гумар і бальнічныя рэаліі — хопіць не толькі на тузін серый. У серыяле, дарэчы, занятыя не толькі беларускія акцёры, сярод якіх Вера Палякова, Ігар Сігоў, Яна Каспяровіч ды іншыя, але таксама сталічная радзільня «Маці і дзіця» і яе персанал.

**Што: драма «Дрэнны добры чалавек»**
**Калі і дзе: СТБ, 21 жніўня, 13.40 і 1.25**



З шэрагу прычын, чаму нельга прапусціць фільм Іосіфа Хейфіца, назавём дзве галоўныя. Па-першае, названы фільм — паводле аповесці А.П.Чэхава «Дуэль». А па-другое, галоўныя ролі ў карціне сыгралі знакавыя асобы савецкага кінематографа — Алег Даль, Уладзімір Высоцкі і Анатоль Папанаў, прычым зрабілі гэта бліскуча.

...У жыцці інтэлігенцыі канца XIX стагоддзя працілегласці не прыцягваліся — яны адштурхоўваліся, прычым з шумам, грукатам і адчувальнымі наступствамі. Вось і сустрэча слабавольнага, баязлівага, схільнага да распусты чыноўніка Лаеўскага і жорсткага, непрымірымага прыхільніка ідэалогіі «натуральнага адбору» заолага фон Корана не магла завяршыцца мірна. Нават тое, што паміж імі пакутаваў добры сябар абодвух, доктар Самойленка, які прымаў кожнага з усімі хібамі і слабасцямі, не ўратавала героя ад дуэлі. Вось толькі завяршылася гэтая гісторыя зусім не так, як планавалася, і чорных або белых людзей тут няма... ■

## Панядзелак, 15 жніўня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Успення і Узнясення Дзевы Марыі.
**9.10, 12.10, 21.45** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Дзённік.
**9.15** Галоўны эфір.
**10.25 Серыял «Грачанка».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.15, 13.10 Меладрама «Пакліч і я прыйду».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.30 Серыял «Сваты-5».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Жанчыны і спорт.
**21.00** Панарама.
**22.10 Серыял «След».**
**0.20** Дзень спорту.
**0.35 Камедыя «Нявеста любой цаной».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.25, 0.50** Тэлебарометр.
**9.10** М/с «Сябры анёлаў».
**11.00** «Разбуральнікі міфаў».
**12.10 Серыял «Косці».**
**13.10** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**14.15** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**15.25** Рэпарцёр.
**16.20** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Мужчыны. Польшча — Славенія.
**17.45** Гандбол. Мужчыны. Германія — Егіпет.
**19.15** Суперлато.
**20.10** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Баскетбол. Мужчыны. Нігерыя — Бразілія.
**22.00** КЕНО.
**22.05** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Мужчыны. Францыя — Данія.
**23.25** Валейбол. Жанчыны. Польшча — Куба.

### Беларусь 3

**8.00, 13.00, 18.45, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 13.15** «Размовы пра духоўнае».
**8.25, 12.00, 13.25, 21.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.30, 20.00** «Другі бок легенды». Адмірал Шчасны. Першы прыгавор.
**9.10 «Кахаць па-руску-2». Меладрама.**
**10.45** Хіт-парад «Сто песняў для Беларусі».
**11.35** «Наперад у мінулае».
**12.35** «Музеі Беларусі». Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.
**13.35 «Да мяне, Мухтар!» Драма.**
**14.55, 21.50** «Час кіно».
**15.00 «Дрэва жадання». Драма.**
**16.45** «Партызаны супраць Вермахта». Дак. серыял.
**17.40 «І ты ўбачыш неба». Драма.**
**19.00** «Выбары-2016».
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Зграя». Драма.**
**23.35** «Апошні герой». Дак. фільм пра жыццё і творчасць Віктара Цоя.
**0.40** «Геапалітыка: свет за тыдзень».

### Беларусь 5

**6.20, 14.55** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Дзённік.
**6.45** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Жанчыны. Нарвегія — Румынія.
**8.20** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Валейбол. Жанчыны. Бразілія — Расія.
**10.10** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Агляд дня.
**15.00** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Веславанне на байдарках і каноэ. Лёгкая атлетыка.
**18.10, 22.10** PRO спорт. Навіны. Рыа-2016.
**18.15** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Бокс.
**19.15** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Сінхроннае плаванне. Дуэты. Тэхнічная праграма.
**20.00** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гімнастыка спартыўная. Фіналы ў асобных відах.
**22.15** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Барацьба грэка-рымская. Мужчыны. 85 кг. 130 кг.
**1.00** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Цяжкая атлетыка. Мужчыны. 105 кг.
**2.40** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Лёгкая атлетыка.
**4.50** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Валейбол. Мужчыны. Бразілія — Францыя.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20, 13.10 Серыял «Усмешка перасмешніка».**
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.20** «Бесталковыя нататкі».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Адваротны адлік». «Барселона-92. Апошняе золата».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Прыгажуня».**
**22.00** «Беларусь без межаў з гуртам "Без Билета"».
**22.45** Да юбілею кампазітара. «Мікаэл Тарывярдзіеў. Гульня з лёсам».
**23.45** «Музычны вечар Мікаэла Тарывярдзіева».
**1.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Мінщчына».
**6.20, 7.50** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 10.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.35** «Тыдзень».
**9.30** «Вялікае снеданне».
**10.10** «Далёкія сваякі».
**10.50** «Сямейныя драмы».
**11.45** «Не хлусі мне!»
**12.40, 18.05** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**15.55** «Рамонт па-сумленнаму».
**16.50** «Вялікі горад».
**17.35 «Следакі». Серыял.**
**19.00** Выступленні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тайны Чапман».
**23.55 «Энігма». Серыял.**
**0.45** «Апошні канцэрт гурта "Кіно"».

### МІР

**6.00** М/ф.
**6.20 Маст. фільм «Аддаласць».**
**9.05 Серыял «Выкраданне багіні».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Трэш-тэст».
**13.45 Маст. фільм «Прадчуванне».**
**15.30** «Няма праблем».
**16.20** «Нітка да ніткі».
**16.50** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 0.15 Серыял «Невідзімкі».**
**19.20 Серыял «Калыска над безданню».**
**22.00 Маст. фільм «Фота на дакументы».**
**23.45** Дак. серыял «Іншы свет».
**2.00** — Прафілактыка на тэлеканале.

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.05 Маст. фільм «Нінчына каханне».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Чужое жыццё».**
**19.10, 20.50 Серыял «Тайны следства».**
**21.55, 23.10 Серыял «Пісьмы на шкле».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.45** Ядзім дома.
**14.15 Серыял «Кодэкс гонару».**
**15.05, 16.20 Серыял «Павуціна».**
**19.40 Серыял «Дзікі».**
**23.00 Серыял «Шаман».**

### 8 канал

**7.00, 14.55, 19.20, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 15.00 Камедыя «Цацка».**
**8.50** Дак. фільм «Фантастыпрадказальнікі».
**9.40 Серыял «На дарозе».**
**10.30 Драма «Падмена».**
**12.50 Трылер «Стрынгер».**
**14.45, 17.50, 19.10, 21.00** «Хатняя крама».
**16.30** «Дзецям пра зверанят».
**17.00 Серыял «І нікога не стала».**
**18.00 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**19.30 Серыял «Уцёкі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Імгла».**
**23.05 Серыял «Баншы».**

### ВТБ

**6.00, 17.30, 23.45, 4.30** Скетчшоу «Даеш моладзь».
**6.30, 13.50, 0.00, 3.30** Скетчшоу «6 кадраў».
**7.00, 17.00** «Лаві момант».
**7.30, 18.00** Серыял «Тата на вырост».
**8.30** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.00, 14.30** «Ералаш».
**9.30, 19.10** Серыял «Васьмідзясятыя 5».
**10.30** «Кіно ў дэталях».
**11.30** Трылер «Ілюзіяніст».
**15.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**18.00** Серыял «Тата на вырост».
**20.20** Серыял «Святлафор 5».
**21.30** Серыял «Кухня 5».
**23.15, 4.00** «Уральскія пельмені».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** «Скакуха». Маст. фільм.
**11.50** «Сакрэты старых майстроў». Фядоскіна.
**12.05** «Хлеб і голад». Дак. праект.
**12.45** «Смерць пад ветразем». Маст. фільм.
**15.10** «Жар-птушка Івана Білібіна». Дак. фільм.
**15.55** «Не кватэра — музей». Мемарыяльны музей-кватэра У.У. Набокава.
**16.10, 22.15** «Космас — падарожжа ў прасторы і часе». Дак. серыял.
**16.50, 20.25, 2.40** Сусветныя скарбы.
**17.05, 1.40** IX Міжнародны конкурс арганістаў імя Мікаэла Тарывярдзіева.
**18.05** «Улюбіцца ў Арктыку». Дак. серыял. 1-я серыя.
**18.35** «Алег Табакоў. У пошуках радасці. Тэатральная аповесць у пяці вечарах». Вечар 1-ы.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** «85 гадоў з дня нараджэння Мікаэла Тарывярдзіева. «Астравы».
**20.40** Оперныя тэатры свету. «Ла Скала».
**21.35** Улада факта. «Першая руская рэвалюцыя: вытокі і вынікі».
**23.00** Тайны душы. «Архетып. Неўроз. Лібіда». Ян Стывенсан.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Ж. Сімянон. «Мегрэ і чалавек на лаўцы». Тэлеспектакль. Запіс 1973 года. Частка 1-я.
**1.15** «Blow-Up. Фотапавелічэнне. Вера Палазкова».

### Настальгія

**6.00** Фільм-канцэрт «Адліга». Юрый Шаўчук і гурт «ДДТ». 1988 год.
**7.00** «Час пік» з Дзмітрыем Кісялёвым. 1996 год.
**7.25, 8.30, 11.30, 12.55, 17.35, 18.50, 20.45, 21.40, 1.50, 3.40** Музычная настальгія.
**7.50** «Тэма» з У. Лісцьевым. «Свабоднае каханне». 1992 год.
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «Жыве такі хлопец».
**12.00** Фільм-канцэрт «Міхаіл Жванецкі. Сам-насам з сабой...» 1992 год.
**13.30** «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт Канстанціна Нікольскага. 1992 год.
**14.10** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 1994 год.
**14.25** Фільм-канцэрт Марылі Радовіч «Фотаздымак у ліпені». 1987 год.
**15.20** Маст. фільм «Шафёр на адзін рэйс».
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгарадцавым. «Віктар Цой». 2005 год.
**19.20** Дак. фільм «Вельмі вас усіх люблю».
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Дуэт «Баккара» і Фрэнсіс Гоя. 2007 год.
**23.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Андрэй Міронаў. 2001 год.
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1961. 2-я частка. 2011 год.
**1.05** «Тэатральны раман» з Эдвардам Радзінскім. «Маскоўскія тэатры ў 60-я гады...» 1-я частка.
**2.10** «Кінапанарама». «Юбілейны выпуск. 20 гадоў». 1982 год. 2-я частка. 1982 год.
**4.00** Фільм-спектакль «Варшаўская мелодыя». 1969 год.

### EuroSport 1

**5.00, 10.30, 13.05, 15.05, 18.00, 21.45, 2.35** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**8.00, 23.05, 23.40, 1.35** Watts.
**9.25, 13.00, 15.00, 21.30, 23.00, 23.50, 1.30, 2.30** «Дарога да золата».
**9.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
**19.30, 0.00** Футбол. Таварыскі матч. «Барусія» (Дортмунд) — «Зандхаўзен».
**23.15** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.

### Кінакамедыя

**0.10** «Дыска». Камедыя.
**2.00** «Халасцякі ў адрыве». Камедыя.
**3.45** «Даю год». Меладрама.
**5.30** «Штосьці падобнае на шчасце». Камедыя.
**7.10** «Разумнікі». Драма.
**8.50** «Шэф». Камедыя.
**10.25** «Гуляй, як Бэкхэм». Меладрама.
**12.25** «Шайбу! Шайбу!» Камедыя.
**14.00, 14.50, 15.35** «Паміж намі». Скетчкам.
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** «Цяжарны». Камедыя.
**17.40** «Сэрца воіна». Баявік.
**19.30** «Вясельная вечарынка». Камедыя.
**21.15** «Каханне ад усіх хваробь». Камедыя.
**23.10** «Вялікае вяселле». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45** «Доктар I...»
**8.15, 18.55, 1.50** «Гісторыя кахання». Серыял.
**10.05, 3.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Асцярожна, махляры!»
**12.20** «Без падману».
**13.10** «Карасі». Маст. фільм.
**15.05** «Хэлоў, Раша».
**16.00** «Паненка-сялянка».
**16.55** «Жыццё ў іншы бок». Дак. фільм.
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**21.00** «Ежа, я люблю цябе».
**22.00** «Рэвізора».
**23.00** «Гісторыі выратавання».
**23.30** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**1.00** «Ежа, я люблю цябе».
**5.05** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 14.10** Фантастыка «Гатака».
**8.10, 3.50** Драма «Доўгія заручыны».
**10.30** Трылер «З мяне хопіць».
**12.30** М/ф «Прыгоды Дэспера».
**16.10** М/ф «Труп нявесты».
**17.40** Драма «Чорны ястраб».
**20.10** Драма «Настаўнік на замену».
**22.10** Трылер «Гіпнатызёр».
**0.20** Камедыя «Працячка».
**2.10** Драма «Станцыя «Фрутвейл».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.25** Драма «Час пік».
**8.20, 2.20** Камедыя «8 першых спатканняў».
**10.10, 4.10** Драма «Мой зводны брат Франкенштэйн».
**12.30** Дэтэктыў «Гатэль «У загінулага альпініста».
**14.10** Камедыя «Даўн Хаус».
**16.05** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».
**20.20** Драма «Пячорын».
**22.20** Меладрама «14+».
**0.20** Дэтэктыў «Прэзумпцыя віны».

### National Geographic

**6.00** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**6.45, 7.35, 13.10, 14.20, 20.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10, 13.55** Гульні розуму.
**8.25, 14.40, 21.00, 1.00, 3.25** Ліхтугі за мяжой.
**9.10, 15.30, 21.45, 1.50, 4.15** Выратаваць кожнага.
**10.00, 17.40** Вяртанне з мёртвых.
**10.50, 18.35** Даследчык 2.0.
**11.40** Незвычайныя промыслы.
**12.20, 16.10, 23.25** Расследаванні авіякатастроф.
**17.00, 0.10** Уварванне на Зямлю.
**19.30, 22.35, 2.35** Космас. Прастора і час.

### Discovery

**8.00** Пяцёрка лепшых.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Паляўнічыя на склады.
**11.00, 1.00, 7.10** Бітва з акіянам.
**12.00** Мяцежны гараж.
**13.00, 6.20** Што было далей?
**15.00, 5.30** Хуткія і гучныя.
**16.00, 2.55** Вялікі махінатар.
**18.00** Аляска: сям'я з лесу.
**19.00** Інжынерыя немагчымага.
**20.00** Бягом па Брытаніі.
**22.00** Выжыванне без купюр.
**23.00** Стаць мужчынам.
**0.00** Амерыканскі Тарзан.
**2.00, 4.40** Склады.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Субота, 20 жніўня

### Беларусь 1

**6.25** Існасць.
**6.50, 22.05 Драма «Паляванне».**



**8.30** Буйным планам.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 12.10, 21.40** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Дзённік.
**9.55 Серыял «Сваты-5».**
**11.05** 50 рэцэптаў першага.
**12.15** Дача.
**12.55** Здароўе.
**13.50, 15.45 Меладрама «Вой, ма-мач-кі!»**
**15.15** Краіна.
**21.00** Панарама.
**1.25** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05, 1.25** Тэлебарометр.
**7.10 Серыял «Класная школа».**
**8.10** Беларуская кухня.
**8.45** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**9.40** Занадта шмат хвастоў.
**10.15 Камедыя «Гатэль для сабак».**
**12.05 Серыял «Шчаслівыя разам 2».**
**13.55** Капейка ў капейку.
**14.50 Камедыя «Злаві мяне, калі зможаш».**
**17.25** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Жанчыны. Матч за 3-е месца.
**19.15** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Валейбол. Жанчыны. Матч за 3-е месца.
**21.20** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Баскетбол. Жанчыны. Фінал. У перапынку: Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**23.20** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Футбол. Мужчыны. Фінал.

**8.00, 14.00, 16.45, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 17.00** «Белыя росы». Камедыя.
**9.40** «Легенды беларускай эстрады». Віктар Вуячыч «Я вярнуся...»
**10.05** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-1994».
**11.00 «Пісьмы да жывых». Драма.**
**12.35** «Партызаны супраць Вермахта». Дак. серыял.
**13.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**14.15** «Час кіно».
**14.20 «Пакаянне». Драма.**
**18.25** «Навукаманія».
**18.55 «Лавіна». Меладрама.**
**20.40** «Калыханка».
**21.15** «Засакрэчанае каханне. Марсэль і Мар'яна». Дак. фільм.
**22.00 «Кахаць па-руску-3». Меладрама.**
**23.35** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**6.40, 14.55** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Дзённік.
**7.05** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Баскетбол. Мужчыны. Паўфінал.
**8.45** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Мужчыны. Паўфінал.
**10.25** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Водная пола. Жанчыны. Фінал.
**11.50** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Агляд дня.
**15.00** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Веславанне на байдарках і каноэ.
**16.30** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Таэквандо. Мужчыны. 80 кг. Жанчыны. 67 кг.
**18.50** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Мастацкая гімнастыка. Групавое мнагаборства. Кваліфікацыя.
**20.00** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Бокс.
**21.25** PRO спорт. Навіны. Рыа-2016.
**21.30** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Мастацкая гімнастыка. Індывідуальнае мнагаборства. Фінал.
**23.45** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Таэквандо. Мужчыны. 80 кг. Жанчыны. 67 кг. Чвэрцьфіналы. Паўфіналы. Барацьба вольная. Мужчыны. 86 кг. 125 кг.
**0.45** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Жанчыны. Фінал.
**2.10** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Лёгкая атлетыка. Таэквандо. Мужчыны. 80 кг. Жанчыны. 67 кг. Фіналы.
**4.50** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Валейбол. Жанчыны. Фінал.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05 Маст. фільм «Раманс пра закаханых».**



**14.40** «Я нясу ў далонях свята». Канцэрт Тамары Гвердцытэлі.
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.25** «Маршрут пабудаваны».
**18.00** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**19.00** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35 Меладрама «Д'ябал носіць Prada».**
**0.35 Маст. фільм «Адбой».**

### СТБ

**6.25 «Турысты». Серыял.**
**7.55 Камедыя «Кейт і Леа».**
**10.00** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.45 «Салдаты 12». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 2.00 Маст. фільм «Свой хлопец».**
**14.55** «Самая карысная праграма».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.35** «Прагнасць».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Нам і не снілася».
**22.40** «Кранутыя». Серыял.

### МІР

**6.00, 8.20, 15.15, 3.30** М/ф.
**7.55** «Саюзнікі».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45, 0.15 Маст. фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00 Маст. фільм «Сабрына».**
**16.15 Серыял «Банды».**
**22.15 Маст. фільм «Рыа, я люблю цябе».**
**2.05 Маст. фільм «Музычная гісторыя».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Чужыя мары».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25 Камедыя «Сем нявест яфрэйтара Збруева».**
**13.10, 14.15** «Ізмайлаўскі парк».

**15.00 Маст. фільм «Абмяняйцеся пярсцёнкамі».**
**16.45 Маст. фільм «Муж на гадзіну».**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.35** Юбілейны канцэрт Ігара Нікалаева.
**22.15 Маст. фільм «Берагі».**
**1.20** «Шыфры нашага цела. Смех і слёзы».

### НТБ—Беларусь

**5.45** «Астрапрагноз».
**5.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.40** «Вуснамі немаўляці».
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.05** «Я худзею».
**14.10, 16.20 Серыял «Адысея сышчыка Гурава».**
**18.10** «Следства вялі...»
**19.20** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.10 Серыял «Пёс».**
**22.50** «Суперстар» прадстаўляе: «Жэня Белавусаў. Вяртанне зорнага хлопчыка».

### 8 канал

**9.00, 15.45, 19.55, 21.15, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.50 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**10.40** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.50, 15.50, 19.00, 21.00** «Хатняя крама».
**11.05 Серыял «На дарозе».**
**14.30** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Лэдзі — дэтэктыў».**
**17.30, 19.10, 20.00 Серыял «Агнём і мячом».**
**20.50** «Вечарынка».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Чорны ястраб».**

### ВТБ

**6.00, 7.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**8.00, 13.30, 22.45, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**8.45** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.30, 12.00** «Ералаш».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.30, 23.30** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**14.00** «Кіно ў дэталях».
**15.00** Камедыя «Суперфарсаж».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**18.30** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**20.30** Фэнтэзі «Па-за часам».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».
**4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «З жыцця адпачывальнікаў». Маст. фільм.
**11.55** «Рэгімантас Адамайціс». Дак. фільм.
**12.35** «Факультэт непатрэбных рэчаў». «Новыя слоўнікі рускай мовы».
**13.05, 1.05** «Рэкардсмены са свету жывёл». Дак. фільм.
**14.00** «Ірына Архіпава. Архітэктура гармоніі». Дак. фільм.
**14.40** Легендарныя спектаклі Вялікага. Уладзімір Атлантаў, Ірына Архіпава ў оперы «Садко». Запіс 1980 года.
**17.40** Па слядах тайны. «У падземных лабірынтах Эквадора».
**18.30** «Барыс Андрэеў. У нас таленту шмат...» Дак. фільм.
**19.10** «Шлях да прычала». Маст. фільм.
**20.35** «Муслім Магамаеў. Маляваць, потым співаць». Дак. фільм.
**21.15** «Муслім Магамаеў. Шлягеры XX стагоддзя».
**22.40** Новае расійскае кіно. «Летнія людзі (дачнікі)». Маст. фільм.
**0.05** Джаз удваіх. Ігар Брыль і Валерый Грахоўскі.
**1.55** «Шукальнікі». «Люстра купцоў Елісеевых».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**7.05, 8.30, 9.40, 10.55, 13.00, 14.50, 15.40, 17.45, 23.30, 1.05, 2.50, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.25** «Вясёлыя рабяты». 1985 год.
**8.45** Дак. фільм «Сумленны фатограф».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Народжаныя ў СССР». Алег Табакоў. 2011 год.
**11.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Яўген Веснік.
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1962. 1-я частка. Эльдар Разанаў. 2010 год.
**13.20** «Кінапанарама». «Ганна Маньяні». 1983 год. 1-я частка.
**14.05** «Тэатральны раман» з Эдвардам Радзінскім. «Маскоўскія тэатры ў 70-я гады...» 2-я частка.
**16.25** Фільм-спектакль «Юнона і Авось».
**18.00** «Тэма» з У. Лісцьевым. «Дзеці знакамітасцяў». 1992 год.
**18.45** «Зямля — Паветра». «Ночные снайперы». 2002 год.
**20.05** «Эканоміка ў пошуках ісціны». 1990 год.
**20.30** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Маналог».
**0.00** «Спяём, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2007 год.
**1.30** Маст. фільм «Юлька».
**4.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Рок-гурты «Мегаполис» і «Манго-Манго». 2012 год.

### EuroSport 1

**4.00, 8.30, 17.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Найлепшае.
**5.00, 18.00** Веласпорт. «Вуэльта». Найлепшае.
**6.00, 9.35, 21.50, 1.05** Watts.
**6.30, 10.00, 15.05** Веласпорт. Класіка. Найлепшае.
**7.30, 16.00** Веласпорт. «Джыра д'Італія». Найлепшае.
**9.30, 15.00, 21.35, 1.00, 2.30** «Дарога да золата».
**11.00, 13.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**19.00, 21.15** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
**19.15, 1.30** Веласпорт. «Вуэльта».
**22.15** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**22.45** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**2.35** Баявыя майстэрствы. Суперкомбат.

### Кінакамедыя

**0.35** «Цяжарны». Камедыя.
**2.10** «Былыя: лепшыя сябры!» Меладрама.
**4.00** «Мой самы страшны кашмар». Меладрама.
**5.50** «Шчаслівае сямейства». Камедыя.
**7.20** «Той яшчэ Карласан!» Камедыя.
**8.50** «Поўнае ператварэнне». Камедыя.



**10.20** «Каханне ад усіх хвароб». Камедыя.
**12.15** «Вясельная вечарынка». Камедыя.
**14.05** «Дзеці сексу не перашкода». Драма.
**16.00** «Дом з паранармальнымі з'явамі». Камедыя.
**17.35** «Дом з паранармальнымі з'явамі 2». Камедыя.
**19.10** «Чаго хочуць жанчыны?» Меладрама.
**21.20** «Утаймаванне свавольнага». Камедыя. 1-я серыя.
**23.15** «Як па масле». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.05** «Хронікі маскоўскага побыту».
**10.55** «Доказ віны».
**11.30, 1.20** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.05** «Сезон палявання 3». М/ф.



**16.15** «Блокбастары».
**17.20, 4.15** «Алігарх ТБ».
**17.55** «Хэлоў, Раша».
**18.55** «Географ глобус прапіў». Маст. фільм.
**21.20** «Закладніца». Маст. фільм.
**23.25** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Як прыручыць голад».

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Трылер «Прафесіянал».
**8.10, 4.00** Фэнтэзі «Буйная рыба».
**10.20, 2.10** Драма «Манглхорн».
**12.10** Трылер «Пакой страху».
**14.10** Камедыя «Прывіды былых сябровак».
**16.10** Фэнтэзі «Залаты Компас».
**20.10** Трылер «Анёлы і Дэманы».
**22.35** Меладрама «Дом каля возера».
**0.20** Камедыя «Тату зноў 17».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Трагікамедыя «Коля — Перакаці поле».
**8.20, 2.20** Камедыя «У стылі jazz».
**10.20, 4.25** Драма «Бубен, барабан».
**12.20** Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».
**14.10** Меладрама «Пацалунак скрозь сцяну».
**16.10** Камедыя «Атамны Іван».
**20.20** Трагікамедыя «Неадэкватныя людзі».
**22.20** Драма «Сіндром Пятрушкі».
**0.20** Меладрама «Пацалунак матылька».

### National Geographic

**6.00** 90-я. Найвялікшыя футбольныя моманты.
**6.50, 7.30, 8.40, 13.15** Гульні розуму.
**7.10, 7.55, 14.20, 4.45** Навукова недарэчнасці.
**11.45** Незвычайныя промыслы.
**12.30, 23.25, 2.30** Расследаванні авіякатастроф.
**14.45** Навука будучыні.
**19.20** Космас. Прастора і час.
**20.10** Замагільны свет Егіпта.
**21.00** Тайны Тутанхамона.
**21.45, 1.40, 4.00** Захавальнікі скарбаў Егіпта.
**22.30** Зорная размова.
**0.10** Паранармальнае.
**1.00, 3.10** Прарыў.

### Discovery

**8.00, 0.00** Смяротны ўлоў.
**9.00, 2.00** Выжыванне без купюр.
**10.00** Амерыканскі Тарзан.
**11.00, 4.40** Паляўнічыя на склады.
**12.00** Іржавая імперыя.
**13.00** Бітвы за кантэйнеры.
**14.00** Махінатары.
**15.00, 2.55, 6.20** У пагоні за класікай.
**16.00, 5.30** Вулічныя гонкі.
**17.00** Аэрапорт знутры.
**22.00** Інжынерыя немагчымага.
**23.00** Мегаперавозкі.
**1.00** Аляска: апошні рубеж.
**3.50** Уцёкі з Алькатраса.
**7.10** Бягом па Брытаніі.

## Zамор'е

### УРАД — НА ЗАРАДКУ!

**Першае пасяджэнне абноўленага кабінета міністраў Перу скончылася зарадкай у двары рэзідэнцыі кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт краіны Педра Пабла Кучынскі паабяцаў зрабіць спартыўныя заняткі для міністраў штотыднёвымі, паведамляе The Guardian.**



Кучынскі правёў першае пасяджэнне новага ўрада напярэдадні. Пасля нарады ён і 11 з 19 міністраў выйшлі на двор рэзідэнцыі і каля паўгадзіны рабілі практыкаванні, што выклікала захапленне ў тых гледачоў, якія сабраліся за плотам. У далейшым 77-гадовы кіраўнік дзяржавы, якому падчас передвыбарнай кампаніі даводзілася неаднаразова адказваць на пытанні пра ўзрост і стан здароўя, паабяцаў праводзіць такія зарадкі кожную сераду. Паводле яго слоў, у краіне, дзе больш за палову насельніцтва мае лішнюю вагу, вельмі важна прапагандаваць здаровы лад жыцця.

### СТУДЭНТЫ НАПАЛОХАЛІ РЭКТАРА

**Рэктар Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Берклі выкапаў падземны ход — на выпадак, калі студэнты зладзяць акцыю пратэсту, паведамляе тэлеканал Fox News.**



Нікалас Дзіркс выдаткаваў на стварэнне лаза паблізу свайго кабінета каля дзевяці тысяч долараў. Сума была выдзелена з бюджэту навучальнай установы. Прадстаўніца ўніверсітэта патлумачыла рашэнне як неабходную меру бяспекі, якая дазволіць пакінуць будынак. Прадстаўнікі студэнцкага аб'яднання выступілі супраць будаўніцтва падземнага ходу. «Павінны быць іншыя спосабы справіцца з незадаволенасцю і пратэстамі студэнтаў, каб пазбегнуць іх», — пракаментаваў тое, што здарылася, кіраўнік студэнцкага саюза. Ідэя будаўніцтва праходу з'явілася пасля масавай акцыі пратэсту студэнтаў у красавіку 2015 года, калі яны наладзілі сядзячую забастоўку ў прыёмнай Дзіркса. Для таго, каб вывесці шумных маладых людзей, кіраўніцтва ВНУ выклікала паліцыю.

### СТАРАЯ ЗА СТАРОЕ

**Пенсіянерка з Польшчы апынулася перад судом за тое, што падсыпала снатворнае ў ежу, а затым рабавала сваіх кавалераў, з якімі знаёмілася праз аб'явы для адзінокіх людзей, паведамляе BBC News. Слуханні па справе 80-гадовай Яніны М. праходзяць у горадзе Бжэска.**

Паводле версіі следства, пажылая жанчына здзейсніла як мінімум два такія злачынствы. Апошняя ахвяра бабулькі — 78-гадовы пенсіянер, які працаваў у вёсцы Шчурава. Калі Яніна М. займела давер мужчыны, ён запрасіў яе ў госці. Там яна непрыкметна падмяшала яму ў талерку з ежай таблеткі «Лаpaзепам» і, дачакаўшыся, калі ён засне, скрала ў яго грошы, пярсцёнкі і мабільны тэлефон. Кошт скрадзенага агулам склаў каля дзвюх тысяч долараў. Калі суд прызнае жанчыну вінаватай, ёй можа пагражаць да 20 гадоў пазбаўлення волі. Раней пенсіянерка была дзевяць разоў судзімая за крадзяжы і махлярства.

**Іван КУПАРВАС.** hvir@zviazda.by

## Паўднёвую Карэю

**Размясціўшыся на маленькім кавалачку зямлі ў акружэнні трох сусветных «асілкаў» — Кітая, Расіі і Японіі, гэтая цудоўная і незвычайная азіяцкая краіна здолела знайсці свой шлях, вырвацца наперад і атрымаць сусветную вядомасць у многіх галінах.**








1. У Паўднёвай Карэі вельмі незвычайны падыход да ўзросту. Лічыцца, што нованароджанае дзіця мае ўзрост 1 год, і яму спаўняецца 2 у наступны Месяцавы Новы год. Ва ўзросце 100 дзён для малога арганізуецца вялікае свята.

2. У лютым 2015 года Канстытуцыйны суд Паўднёвай Карэі адмяніў закон, які дзейнічаў больш за 60 гадоў і згодна з якім шлюбная здрада лічылася злачынствам, абвясціўшы, што ён супярэчыць Канстытуцыі.

3. Мужчыны Паўднёвай Карэі прос- та апантаныя касметыкай. Яны трацяць шмат грошай на касметычныя прадукты, каб палепшыць сваю знешнасць. Краіна з'яўляецца сусветным лідарам у спажыванні прадуктаў па доглядзе за скурай, купляючы ў чатыры разы больш, чым Данія, якая на другім месцы. Тут таксама самы высокі ў свеце працэнт пластычнай хірургіі на чалавека (на другім месцы Бразілія, трэці — Тайланд).

4. Паўднёвая Карэя — сусветны лідар у карыстанні інтэрнэтам. Ім карыстаецца больш за 90% насельніцтва, і хуткасць злучэння тут самая высокая ў свеце.

5. Мясцовыя жыхары дужа вераць у забабоны. Многія з іх адчуваюць страх перад лічбай 4. У шпіталях і грамадскіх будынках чацвёрты паверх заўсёды прапушчаны ў нумарацыі паверхаў. У жылых будынках чацвёрты паверх часам адзначаны ў ліфтах не лічбай 4, а літарай F. Часта прапускаюцца нумары кватэр, якія змяшчаюць больш за адну чацвёрку. Таксама карэйцы вельмі прымхлівыя ў дачыненні да чырвонага колеру: ён у іх традыцыйна сімвалізуе смерць. Яшчэ ў Паўднёвай Карэі шырока распаўсюджанае павер'е, вядомае як «смерць ад вентылятара». Шмат хто верыць, што калі пакінуць вентылятар уключаным на ноч, гэта можа прывесці да смерці чалавека, які пад ім спіць.

6. Паўднёвая Карэя вядомая сваёй спецыфічнай кухняй, якая актыўна выкарыстоўвае морапрадукты, але нямногія ведаюць, што тут збіраюць больш за 90% спажываемых водарасцяў.

7. Культавая песня «Gangnam Style» паўднёвакарэйскага музыкі Psy стала першым відэа на YouTube, якое займела мільярд праглядаў. У лістападзе 2012 года яно заняло першае месца па колькасці праглядаў, набраўшы 2,5 мільярда. «Gangnam Style» азначае багаты стыль жыцця ў сеульскім раёне Гангнам.

8. Нягледзячы на моцныя спрэчкі і крытыку, якія ўзмацніліся ў апошнія гады, у Паўднёвай Карэі па-ранейшаму ўжываюць у ежу мяса сабак. Існуючая больш за дзве тысячы гадоў жорсткая, на думку многіх, традыцыя — яшчэ жывая, але ўсё больш карэйцаў ад яе адмаўляюцца.

9. Таксі ў Паўднёвай Карэі пафарбаваныя паводле ўзроўню сэрвісу. Шэры ці белы колеры — звычайныя машыны, у якіх могуць апынуцца неспрактыкаваныя кіроўцы, чорны колер — раскошныя машыны з вадзіцелямі экстра-класа ■

## Нядзеля, 21 жніўня

### Беларусь 1

**6.50 Драма «Паляванне».**
8.30 Народная раніца.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10, 12.35, 22.10 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Дзённік.
9.15 «Арсенал».
**9.45 Серыял «Сваты-5».**
11.00 «50 рэцэптаў першага».
**12.40 Меладрама «Кахаю, таму што кахаю».**
14.25 Каробка перадач.
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.15 Жанчыны і спорт.
16.45 Тайны следства.
**17.15 Меладрама «Ілюзія шчасця».**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.35, 4.00 Меладрама «Муж шчаслівай жанчыны».**
**0.20 Меладрама «М + Ж».**
1.50 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Цырымонія закрыцця.
5.30 Відэафільм.

### Беларусь 2

7.05, 14.15, 1.25 Тэлебарометр.
**7.10 Серыял «Класная школа».**
**8.10 Серыял «Шчаслівыя разам 2».**
10.00 «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
11.20 Ваша лата, Пяцёрачка.
11.50 Хачу ў тэлевізар!
11.55 Кіпень.
**12.15 Прыгоды «Каратэ-хлапчук».**
15.25 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Валейбол. Мужчыны. Матч за 3-е месца.
17.30 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Баскетбол. Мужчыны. Матч за 3-е месца.
19.15 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Валейбол. Мужчыны. Фінал.
21.30 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
21.40 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Баскетбол. Мужчыны. Фінал.
23.35 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Мужчыны. Фінал.

### Беларусь 3

8.00, 11.45, 19.20, 21.00 «Калейдаскоп».
**8.15, 22.30 «Трэмбіта». Камедыя.**
9.45 «Бард-парад».
10.25 «Наперад у мінулае».
10.55 Хіт-парад «Сто песняў для Беларусі».
12.05 «Святыні Беларусі». Царква ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы (в. Лукава).
12.30 «Майстры і куміры». Ансамбль народнай музыкі «Бяседа».
**13.25 «Лавіна». Меладрама.**
15.10 «Эпоха Візбара». Канцэрт выканаўцаў аўтарскай песні.
16.20 «Марлен Дзітрых. Вяртанне немагчыма». Дак. фільм.
17.00 «Час кіно».
**17.10 «Марлен». Драма.**
19.35 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Серыял. «Кароль шантажу».
20.40 «Калыханка».
21.20 «The Best Sound Track Hits». Канцэрт Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.

### Беларусь 5

6.55, 16.50 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Дзённік.
7.20 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Баскетбол. Жанчыны. Матч за 3-е месца.
9.00 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Футбол. Мужчыны. Матч за 3-е месца.
11.00 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Воднае пола. Мужчыны. Фінал.
12.25 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Агляд дня.
16.55 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Мастацкая гімнастыка. Групавое мнагаборства. Фінал.
18.45 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Барацьба вольная. Мужчыны. 65 кг. 97 кг.
20.55 PRO спорт. Навіны. Рыа-2016.
21.00 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Бокс.
21.40 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Мужчыны. Матч за 3-е месца.
23.20 Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Воднае пола. Мужчыны. Фінал.

### АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Фазэнда».
**11.20 Маст. фільм «Законны шлюб».**
13.20 «Валдзіс Пельш. Падарожжа да цэнтра Зямлі».
**14.20, 16.20 Серыял «Паляўнічыя на галовы».**
16.15 Навіны спорту.
18.00 «Творчы вечар Ігара Мацвіенкі».
20.00 Контуры.
21.05 Музычны фестываль «Голосящий КиВиН».
**23.20 Фантастыка «Паўстанне планеты малпаў».**

### СТБ

**6.05 «Турысты». Серыял. Заключныя серыі.**
7.40 «Скардзіцца дазваляецца».
8.00, 17.05 «Аўтапанарама».
8.30 «Нам і не снілася».
11.00 «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 12». Серыял.**
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
**13.40, 1.25 Драма «Дрэнны добры чалавек».**
15.30 «Вадзіць па-руску».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.50 «Наша справа».
17.35 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
20.25 «Тытанік. Рэпартаж з таго свету».



**22.10 Драма «Дарагі Фрэнкі».**
0.00 «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 «Даведнік».
6.30 М/ф.
8.30 «Беларусь сёння».
9.00 «Культ/Турызм».
9.30 «Чаму я?»
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.15 Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».**
13.15 «Трымайся, шоубіз!»
**13.45 Маст. фільм «Рыа, я люблю цябе».**
**16.15 Серыял «Банды».**
**22.15 Маст. фільм «Раманы дзённік».**
**0.30 Маст. фільм «Сабрына».**
**2.40 Серыял «Дэман паўдня».**

### РТР—Беларусь

7.00 «Шыфры нашага цела. Смех і слёзы».
**7.45 Маст. фільм «Берагі».**
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.20 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20, 14.15 «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**15.05 Камедыя «Ідэальная пара».**
**16.45 Маст. фільм «Усё вернецца».**
21.00 Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.00 Маст. фільм «Альпініст».**
**23.35 Маст. фільм «Адагрэй маё сэрца».**

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сення.
8.50 Іх норавы.
9.25 Ядзім дома.
10.25 «Першая перадача».
11.00 «Цуд тэхнікі».
11.40 «Дачны адказ».
12.50 «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
13.40 «Паездзем, паядзім!»
**14.10, 16.20 Серыял «Адысея сышчыка Гурава».**
18.10 «Следства вялі...»
**19.20 Маст. фільм «Плата па лічыльніку».**
**22.35 Трылер «Каламбіяна».**

### 8 канал

9.00, 15.20, 18.50, 23.40 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30 «Мой любімы гадавanec».
11.00, 15.10, 18.40, 21.00 «Хатняя крама».
**11.15 Серыял «Камісар Рэкс».**
**12.00 Драма «Гульня».**
**13.40 Трылер «Сярод белага дня».**
15.25 «Прагулка з дыназаўрамі».
**16.50 Серыял «Чыста англійскае забойства».**
**18.55 Трылер «Звышзброя».**
20.50 «Вечарніца».
**21.05 Драма «Адданы садоўнік».**

### ВТБ

6.00, 4.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
6.30 «Здаецца! З рамонтам».
7.30, 3.30 «Лаві момант».
8.00, 16.30, 23.20, 4.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 М/ф «Прыгоды Дзіна».
8.45 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 М/ф «Маша і мядзведзь».
9.30, 16.00 «Ералаш».
10.00, 0.50 «Турбаміксер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.00 Серыял «Збеглыя сваякі».
15.00, 19.30 «Уральскія пельмені».
17.15 Фэнтэзі «Па-за часам».
21.00 Баявік «Падзенне Алімпа».
0.00 Еўрапейскі покерны турнір.
5.30 «Дурні і дарогі».

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
10.35, 0.20 «Выпадак на шахце восем». Маст. фільм.
12.00 «Легенды сусветнага кіно». Уладзімір Басаў.
12.30 «Факультэт непатрэбных рэчаў». «Новая кніга пра Сталпіна».
13.00, 1.55 «Арланы — каралі нябёсаў». Дак. фільм.
13.50 Геніі і ліхадзеі. Герберт Уэлс.
14.20 Спектаклі-легенды. Яўген Лебедзеў, Валянціна Ковель, Алег Басілашвілі, Міхаіл Волкаў у спектаклі БДТ «Гісторыя каня». Запіс 1989 года.
16.25 «Больш, чым каханне». Яўген Лебедзеў і Натэла Таўстаногава.
17.10 «Пешшу...» Масква дачная.
17.35 «Шукальнікі». «Люстра купцоў Елісеевых».
18.20 «Рамантыка рамансa». Шлягеры 60-х.
19.20 «Малады Тасканіні». Маст. фільм.
22.05 З калекцыі тэлеканала «Культура». Вялікі балет-2016. Фінал.
1.45 «У свеце баек». М/ф для дарослых.
2.50 «Кацусіка Хакусай». Дак. фільм.

### Настальгія

6.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1962. 1-я частка. Эльдар Разанаў. 2010 год.
7.05, 8.50, 9.40, 11.45, 17.30, 18.45, 19.40, 20.50, 21.05, 1.00, 2.30, 3.40, 5.00 Музычная Настальгія.
7.20 «Кінапанарама». «Ганна Маньяні». 1983 год. 1-я частка.
8.05 «Тэатральны раман» з Эдвардам Радзінскім. «Маскоўскія тэатры ў 70-я гады...» 2-я частка.
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.25 Фільм-спектакль «Юнона і Авось».
12.00 «Тэма» з У. Ліcцьевым. «Дзеці знакамітасцяў». 1992 год.
12.45 «Зямля — Паветра». «Начныя снайперы». 2002 год.
14.05 «Эканоміка ў пошуках ісціны». 1990 год.
14.30 «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год.
15.00 «Быў час». 2009 год.
16.00 Маст. фільм «Маналог».
18.00 «Акулы пяра». Барыс Грабеншчыкоў. 1996 год.
19.00 «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
20.00 Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
20.20 «Час Пік» з С. Шатуновым. 1995 год.
21.00 «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 1994 год.
21.30 Маст. фільм «Амаль смешная гісторыя».
0.00 «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзіброва. 2008 год.
1.25 «Вясёлыя рабяты». 1985 год.
2.45 Дак. фільм «Сумленны фатограф».
4.00 «Народжаны ў СССР». Алег Табакоў. 2011 год.
5.30 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Яўген Веснік.

### EuroSport 1

4.00 Watts.
5.00, 9.35, 16.45, 21.00, 1.00 Веласпорт. «Вуэльта».
6.30 Баявыя майстэрствы. Суперкомбат.
8.00, 13.00, 19.00, 22.00, 0.10, 2.35 Футбол. Чэмпіянат MLS.
9.30, 15.00, 20.00, 21.55, 0.05, 2.30 «Дарога да золата».
11.00 Веласпорт. Жаночы тур.
15.05, 20.15 Веласпорт. «Ватэнфаль Класік».
16.30, 18.45 Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.

### Кінакамедыя

0.50 «Сэрца воіна». Баявік.
2.40 «Палярны рэйс». Камедыя.
4.20 «Былыя: лепшыя сябры!» Меладрама.
6.05 «Штосьці падобнае на шчасце». Камедыя.
7.45 «Спачатку каханне, потым вяселле». Меладрама.
9.20 «Дом з паранармальнымі з'явамі». Камедыя.
10.55 «Дом з паранармальнымі з'явамі 2». Камедыя.
12.25 «Кекс у вялікім горадзе». Камедыя.
14.00 «Бамбіза Салман». Камедыя.
15.40 «Паміж намі». Скетчком.
16.00 «Поўнае пеpатварэнне». Камедыя.
17.30 «Вялікі Стэн». Камедыя.
19.25 «Жалезнае неба». Камедыя.
21.05 «Вясельная вечарынка». Камедыя.
22.50 «Каханне ад усіх хвароб». Камедыя.

### ТБ3

6.00 М/ф.
9.35 «Паненка і кулінар».
10.10 «Далёка і яшчэ далей».
11.10, 1.55 «Тайны следства». Серыял.
14.50 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.15 «Рэвізора».
20.05 «Без падману».
21.00 «Скала». Маст. фільм.
23.30 «Асцярожна, махляры!»
0.00 «Каліфрэнія». Серыял.
0.30 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
5.10 «Гучная справа».

### ТБ1000

6.10, 18.10 Трылер «Пакой страху».
8.10, 4.30 Меладрама «Дом каля возера».
10.00, 2.10 Трылер «Анёлы і Дэманы».
12.25 Камедыя «Тату зноў 17».
14.15 Фэнтэзі «Буйная рыба».
16.25 Драма «Манглхорн».
20.10 Драма «Жыявенць».
22.15 Баявік «Шпіёнскія гульні».
0.30 Дэтэктыў «Перш чым я засну».

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20, 18.10 Баявік «Слізгаценне».
8.20, 2.20 Трагікамедыя «Неадэкватныя людзі».
10.30, 4.30 Драма «Сіндром Пятрушкі».
12.30 Меладрама «Вернасць».
14.20 Камедыя «У стылі jazz».
16.15 Драма «Бубен, барабан».
20.20 Прыгоды «Форт Рос: У пошуках прыгод».
22.20 Баявік «Антыкілер».
0.30 Драма «Ператварэнне».

### National Geographic

6.00, 7.10, 8.00, 14.40, 5.10 Навуковыя недарэчнасці.
6.45, 7.35, 13.30 Гульні розуму.
8.50 Аўта-SOS.
12.00 Незвычайныя промыслы.
12.45, 23.30 Расследаванні авіякатастроф.
15.00 Космас. Прастора і час.



21.00, 1.10, 3.35 Найгоршае надвор'е ўсіх часоў?
21.50, 2.00, 4.20 Даследчык 2.0.
22.40 Землятрус на Эверэсце.
0.20, 2.45 Паранармальнае.

### Discovery

8.00 Стаць мужчынам.
9.00, 1.00 Аляска: сям'я з лесу.
10.00, 14.00 Выжыванне без купюр.
11.00, 4.40 Аляска: апошні рубеж.
12.00 Паляванне на труфелі.
13.00 Рэальныя дальнабойшчыкі.
15.00, 17.00, 5.30 Разбуральнікі легенд.
16.00 Бягом па Брытаніі.
2.00 Махінатары.
2.55 Бітвы за кантэйнеры.
3.50 Амерыканскі Тарзан.




## Б'Е — ЗНАЧЫЦЬ, ЛЮБІЦЬ! ТОЛЬКІ ТАК?

Як той казаў — не з нас пачалося, не намі скончыцца. Гэта я пра рэўнасць і яе наступствы — калі мужчына б'е твар свайму саперніку, калі жанчына — хвошча вокны саперніцы. Але ж гэта, што называецца, класічны сцэнарый. А бываюць іншыя.

У нас гадоў 50 таму аднаго мужчынку прызначылі вартаўніком лугу. Па тым часе пасада гэта была вельмі адказнай: таму, хто яе займаў, нават стрэльбу выдавалі. І, мусіць жа, добра плацілі, бо тога самага Сашку, апроч работы, нічога не цікавіла: і днём і ноччу на лузе прападаў, сцежкі адмысловыя вытаптаў — імя сябе... Жонка ягоная, Ніна, бывала, прасіцца: «Саша, ты б дома нешта зрабіў... Саша, можа, мы разам некуды схадзілі б, можа, пасядзелі б з людзьмі?» (любіла яна розныя кампаніі і потым песні папець)... Мужык яе — ні за што! Атрымліваецца, быццам ёсць ён у Ніны, і адначасова няма яго (хіба што дзеці на свет з'яўляюцца).

Стамілася жонка ваяваць, плюнула, вырашыла: ідзе ён у луг — і няхай сабе ідзе: з лёгкім ветрам яму. А яна, як нейкае свята, запрашае дамоў кампанію — і вып'юць яны, і паспяваюць, і пасмяюцца, і, сучаснай мовай кажучы, патусяць, бо блізкія ж людзі: сама гаспадыня, матуля яе (Сашава, значыць, цешча), сусед з суседкай, баяніст прышлы (казалі, дарэчы, што прыходзіў ён не толькі пайграць...). Усё пуцём, карацей.

Дык вось. На календары — нейкае чарговае свята, але ж Сашка па сцежцы, як звычайна, паплёўся ў луг. Нінка, адпаведна, нечага насмажыла-напарыла і клікнула гасцей. Ідзе ў хаце гульба! Дым каромыслам!

І трэба ж было здарыцца: забыўся Сашка свой падвячорак: луг абышоў, есці захацеў, а «тармазка» няма. Ён хуткім крокам дадому... Баян і песні яшчэ здалёку пачуў. У двор зайшоў. А далей, як у вядомай песні: «За столом с рыбаком уж гуляет купец / А в окошко глядит удалой молодец...»

Вось і не стрываў ён, той маладзец, — зноў жа, як у песні, «загорелась душа»: разнасцежыў дзверы...

Кампанія знямела — такі ў яго выраз твару быў. А тут жа яшчэ і «дубальтоўка», тут жа — грознае (у бок музыкі):

— Налівай! Усім! Па апошняй!

Прыйшлося наліць хоць рука і дрыжэла)... І выпіць... Нідзе ж не дзенешся.

— А зараз ты і ты (Сашка дулам паказаў на жонку і цешчу) — на выхад і пад дуб (непадалёк ад хаты дрэва ўзвышалася).

Бабы хацелі былі запярэчыць — ён тут жа клацнуў затворам:

— Шнэль! — загадаў па-нямецку.

Спрацавала: жанчыны пайшлі, сталі пад дуб і ўголас. А Сашка — стрэльбу падняў і ба-бах — з абодвух ствалоў!

Пачуўшы гэта, «кампанія», што называецца, з хаты — праз закрытыя дзверы. А Сашка, наадварот, дамоў. Усеўся там за святочным сталом, наліў сабе ў шклянку «белай» (прынесенай, дарэчы, тым самым баяністам), закусіў як належыць: «кракаўскай» каўбаскай, селядцом, Ніннымі налісткамі з тварагом у масле (факт, што кайстрачка з салам і варанымі яйкамі стала непатрэбнай), і падаўся ў луг на службу...

А ўжо адтуль яго сустракалі як самага найлепшага госця: цешча новы ручнік падала рукі выцерці, жонка чарачку паднесла і пакарміла — не толькі бульбай... Бо пераканалася, што раўнуе ён яе, дык, значыцца ж, любіць!..

Праўда, і Сашка пасля таго выпадку шмат што зразумеў. Разам з жонкай калі-нікалі стаў выходзіць у людзі (не так гэта і дрэнна, як аказалася...): шмат песень яго Ніна ведае і спявае вельмі прыгожа. Ну дык тады няхай і людзі слухаюць.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## ЦУДАДЗЕЙНЫ СРОДАК!

— І хто гэта выдумаў, што ў прыроды дрэннага надвор'я няма? — выходзячы з хаты, бурчэў Лаўрэн. — Паглядзі, Настуля — студзень на двары, а ні табе снягоў, ні маразоў! Хіба ж гэта здарова?

— Не, але ж ты з Богам не паспрачаешся... На вось лепей шалік на шыю закруці, — суцішвала старога жонка, — а то змерзнеш ды захварэеш яшчэ.

— Хто? Я? Ды ніколі, — пагладзіўшы грудзі па старой цяльняшцы, адмахнуўся Лаўрэн, — марская душа хвароб не баіцца!

І — галоўнае — каб хто яго за язык цягнуў, а то ж не: сам ляпнуў, сам жа, трэба разумець, і наклікаў на сябе хваробу: ужо пад вечар галава была, што бязмен, горла балела, а да ўсяго яшчэ і кашаль пачаўся.

— Во неслух! Такі ж прастудзіўся? — вохкала ля Лаўрэна жонка. — Зараз буду лячыць.



У гаршчэчку яна запарыла нейкіх зёлак, зрабіла гарачы напой, дала старому выпіць — з ліпавым мёдам. Дзеду палягчэла крыху, але ж не надоўга.

— Заўтра да доктара пойдзеш, — пабязцала гаспадыня. — А сёння давай яшчэ адзін сродак паспрабуем.

З-пад прыпечка яна выцягнула ладны чыгунок, насыпала туды неабабранай бульбы, засунула ў печ.

— Навошта столькі? — здзівіўся Лаўрэн.

— Трэба...

Калі бульба зварылася, Настуля паставіла яе перад мужам на крэсла, прымусіла яго нахіліцца, зверху накрыла шчыльнай посцілкай і загадала:

— Дыхай! Лячыся... А я пайду па гаспадарцы ўпраўлюся.

З паўгадзіны недзе тупала, у хаце не была, а вярнулася і ўбачыла, што муж — ні з месца: як сядзеў, так і сядзіць — пад посцілкай.

— Ды ўжо хопіць, — сказала гаспадыня, стала здымаць яе са старога і войкнула:

— А куды ж гэта бульба дзелася?!

— Дык з'еў, — разгублена прамовіў Лаўрэн.

— Навошта?!

— А што — не трэба было?!. Тады якога ражна пад нос мне паставіла?!

— Я ж сказала — каб дыхаў!

— Во, няправільна зрабіў? — разгубіўся дзед. — І што зараз будзе?

— Паглядзім.

...Паглядзець, і сапраўды, было на што! Палягчэла галава ў Лаўрэна, паздаравела горла, дзе дзеўся той кашаль і насмарк?

Адно слова, бульба — чалавеку тутэйшаму яна пашкодзіць не можа!

**Галіна Гузянкова,**
*г. Гомель.*

## ДАЛІКАТНАЕ МЫЦЦЁ

У час палітычнай нестабільнасці ды розных там катаклізмаў багата размоў пра мігрантаў і бежанцаў. Дзе яны толькі не з'яўляюцца, нават, бывае, у... нас. Не так даўно, напрыклад, прыехала новая сям'я. Людзі як людзі — нічога асаблівага — гаваркія, прыязныя. Вось толькі не зусім прыстасаваныя, мякка кажучы, да мясцовага жыцця: давялося нешта падказваць ім, тлумачыць, дапамагаць. І, можа, усё ў нас да блізкай дружбы дайшло б, калі б...

Дажджоў у тое лета прайшло няшмат і грыбоў, адпаведна, было небагата, але ж у адзін з прыгожых восеньскіх дзён узяў я Міколу ў бліжэйшы хвойнік. Перш-наперш, правёў лікбез: расказаў і паказаў чалавеку, якія грыбы браць нельга, а якія трэба. Ён, як падалося, усё зразумеў. Мы ад душы пахадзілі па лесе і, на здзіўленне, абодва назбіралі па добрым кашы розных там радовак, зялёнак, падзялёнак, васілёў...

Факт, што назад вярталіся цалкам шчаслівыя, хоць дома нас чакаў яшчэ немаленькі клопат, каб давесці грыбы да ладу — перабраць, зварыць...

Мне, як чалавеку больш спрактыкаванаму, удалося гэта хутчэй, чым прыездажаму і, калі ні з чым не параўнальны пах тых грыбкоў (ды з бульбачкай!) «выплыў» за межы дома, калі патэльня з гэтай смакатой паўстала на сярэдзіне стала, а збоку ад яе забялела бутэлечка, я запрасіў Міколу ў госці — на дэгустацыю.

Як і варта было чакаць, той адмаўляцца не стаў.

Сядзім мы, значыць, за сталом, выпіваем памаленьку, гамонім, закусваем дарамі прыроды. Госць пры гэтым нахвальвае іх самымі рознымі словамі! Кажа:

— Дык так жа і язык можна праглынуць!.. Смаката.

— Я адзін бы такую патэльню з'еў... І як гэта ў цябе атрымалася?

— А ў цябе, — пытаюся, — хіба інакш?

— Ну, — прызнаецца Мікола, — хоць я і стараўся. Пачысціў грыбы, памыў, адварыў, а на зуб як паклаў, — скрыпяць, хлера на іх! Пясок застаўся. Не тое што ў цябе.... Можа, ты сакрэт які ведаеш?

— Не, ніякіх сакрэтаў, — адказваю.

І тут быццам нейкі нячысцік з пустой бутэлькі выскаквае і цягне мяне за язык: пажартуй, маўляў, з бедалагі... Вось я ў яго і пытаюся:

— А як ты свае грыбы прамываў — канкрэтна?

— Ды ўсё як ты раіў: і ў вываркі, і пад струменьчыкам вады з-пад крана... Спачатку сырыя, а потым і гатаваныя. Не так неяк трэба было?

— Так-то яно так, — у задуменні пагадзіўся я, — але... Слухай, у цябе машына пральная ёсць?

— Ёсць.

— Дык ты б загрузіў свае грыбкі ў цэнтрыфугу, паставіў на рэжым далікатнага прання, і тады — гарантую — ні пясчынкі б нідзе не засталося!

...Ну хіба ж мог я падумаць, кажучы гэтак, што дарослы, хай і п'янаваты дзядзька прыме мае словы за чыстую манету, што ён і сапраўды, вярнуўшыся дамоў, загрузіць свае грыбы ў машыну і тым самым вывядзе яе са строю?.. Потым — пасварыцца з жонкай, а нарэшце яшчэ і са мной...

Праўду людзі кажуць, што ў дурнога (а п'яны разумным ніколі не бывае) і жарты такія ж.

**А. П.,**
*г. Беразіно.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў

## ШТОДЗЁННАЯ АЛІМПІЯДА



**Кожную раніцу пачынаецца старт, які можа закончыцца крыўдным падзеннем пасярод дыстанцыі, а можа стаць галоўным у жыцці**

Ад Гульняў у Рыа чакалі адчування нечага святочнага і лёгкага — як сам гэты дзівосны горад, як сама Бразілія ва ўяўленні тых, хто там не жыве. Гэткага стракатага карнавалу пад гукі самбы і шум акіяна, калі ўвесь час усміхаешся без асаблівай прычыны, а ногі самі вытанцоўваюць нешта радасна-бесклапотнае...

Не ведаю, як у вас, а ў мяне атрымалася з дакладнасцю да наадварот: адчуванне ад таго, што адбываецца на іншым кантыненце, — самае што ні ёсць агіднае (якраз пад цяперашняе наша надвор'е). І нават не таму, што ў нашай зборнай няма пакуль медалёў — шанцы яшчэ застаюцца, дый надзея памірае апошняй. Проста сёлетняя Алімпіяда па сваім настроі — не спаборніцтвы і радасць, а пастаяннае прадчуванне чарговага скандалу, боль і слёзы. І калі нaконт скандалаў ужо даўно ўсё зразумела — калі і як, пэўна, і не згледзеў ніхто, але спорт сёння дакладна ператварыўся ў палітыку — дык з болем і слязьмі гэтым разам, здаецца, перабор. Чаго вартыя жудасныя траўмы, атрыманыя спартсменамі. Усё па максімуме: калі ўжо ламаць нагу — дык у двух месцах, каб аж павісла на сухажыллях; калі падаць з веласіпеда на мокрай трасе — дык з трайным пераломам пазваночніка. У параўнанні з гэтым правалы яшчэ ў адборачных турах фаварытаў, якія марылі аб п'едэстале, выглядаюць драбнавата, але толькі не для саміх спартсменаў. Іхнія слёзы не менш шчырыя і адчайныя, чым слёзы тых, каго са спаборніцтваў выносілі на санітарных насілках.

Яно і зразумела: ці варта было на працягу як мінімум чатырох гадоў многім ахвяраваць, ад многага адмаўляцца, перамагаць боль і абставіны дзеля нейкай мэты, якая здавалася такой блізкай?.. А вось адзін няўдалы рух — і ўжо мэта стала прывіднай, недасягальна далёкай, а ад прыгожай мары застаўся толькі друз рэальнасці. А яны, дзівакі, нават прайграўшы ў нейкай там 1/32 фіналу, нават з бальнічнай палаты з усмешкамі, больш падобнымі на грымасы, заяўляюць у відэакамеру аб тым, што абавязкова вернуцца, і дасягнуць, і пераможаць. Тэатр абсурду, дый годзе!..

Хоць, калі разабрацца, дык многія з нас не лепшыя за гэтых дзівакоў. Так, пэўна, задумана Творцам, каб чалавеку нічога не давалася лёгка. Вось тут і праяўляецца тая самая свабода выбару — найвышэйшы дар Нябёсаў. Або ты, пакорліва ўздыхаючы, гаворыш «лёс такі» і пры першым жа няззначным абломе кідаеш пачатую справу, або, яшчэ не раз спатыкаючыся і падаючы, упарта ідзеш далей. Мы ж жывём не «дзякуючы», а «насуперак». Штодня змагаючыся з абставінамі, з перашкодамі, з уласнай лянотай, абыякавасцю, жаданнем махнуць на ўсё рукой па прынцыпе «як ёсць, так і добра». У кожнага з нас штодня свае ўласныя Алімпійскія гульні, кожную раніцу пачынаецца старт, які можа закончыцца крыўдным падзеннем пасярод дыстанцыі, а можа стаць галоўным у жыцці. І неістотна, якога маштабу наша перамога ў вачах іншых — значная ці зусім незаўважная. Магчыма, менавіта яна — самая важная прыступка да асабістага п'едэстала.

Я тут дарэчы прыгадаю гісторыю адной дзесяцігадовай дзяўчынкі. У школе яна з першага класа была выдатніцай, і пачатковая навука давалася ёй без цяжкасцяў. Адно былі праблемы з чыстапісаннем — ляпіла тое дзяўчо літары ў словы ды сказы без памылак, але абсалютна абы-як. Бацькі толькі пасмейваліся, маўляў, доктарам будзе, і не звярталі на гэта асаблівай увагі. Ёй таксама было ўсё роўна, пакуль настаўніца не паказала яе сшытак усяму класу, грэбліва трымаючы яго двума пальцамі, бы якое агіднае насякомае. Клас рагатаў радасна — дзеці вельмі зайздросныя і злосныя істоты. Дзяўчынка сядзела апусціўшы галаву і глытаючы слёзы — гэта была першая ў яе свядомым жыцці няўдача. Пасля ўрокаў яна купіла самы тоўсты — на васямнаццаць старонак — «першакласны» сшытак у касую лінейку. І да позняй ночы старанна выводзіла ў ім літары, спісаўшы вялікімі і малымі кожны радок на тых васямнаццаці старонках.

Назаўтра пісалі дыктант. У настаўніцы ад здзіўлення палезлі на лоб акуляры, калі замест «нататак п'янага егіптолага» яна ўбачыла роўненькія каліграфічныя літары. Праз колькі часу дзяўчынцы з-за сякіх-такіх творчых здольнасцяў, пісьменнасці, але галоўнае — з-за прыгожага почырку даверылі рэдагаваць спачатку класную, а пасля і школьную насценгазету. І так ёй гэта справа спадабалася, што яна вырашыла паступаць на журфак. Бал пры конкурсе шэсць чалавек на месца ў яе быў напалову прахадны — маглі прыняць, маглі не. І асноўным аргументам «за» сталі фоткі той самай насценгазеты, напісанай літарамі, якія яна ў трэцім класе, змагаючыся са сном, старанна выводзіла ледзь не да раніцы. Тое першае выйгранае спаборніцтва з самой сабой зусім нечакана стала лёсавызначальным.

Цяпер, праз шмат гадоў, яна ведае гэта дакладна і мае права пра гэта напісаць, праводзячы паміж Алімпійскімі гульнямі і жыццём паралелі, якія камусьці на першы погляд пададуцца зусім нелагічнымі...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, 15. Тел. +375 17 256 90 05** |

**Предмет аукциона**

**Транспорт и спецтехника, расположенные по адресу:** г. Минск, ул. Гурского, 16а и г. Кричев, ул. Комсомольская, 103а, в составе:

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 499 | Автобус «Радимич» А0921 (с доп. опц.) (рег. знак AI 9192-7), 2010 г.в. | 22 471 руб. 86 коп. (224 718 624) | 1 123 руб. 59 коп. (11 235 931) |
| 2 | 97 | Автомобиль Тойота HIGHLANGER кузов №JTEES42A202190347 (рег. знак 5500 ОО-7), 2011 г.в. | 39 541 руб. 83 коп. (395 418 348) | 1 977 руб. 09 коп. (19 770 917) |
| 3 | 218 | Кран КС 357721 (рег. знак АА 6063-7) | 11 452 руб. 01 коп. (114 520 068) | 572 руб. 60 коп. (5 726 003) |
| 4 | 223 | Кран РДК 250-3. 1990 г.в. | 31 330 руб. 96 коп. (313 309 620) | 1 566 руб. 55 коп. (15 665 481) |
| 5 | 461 | Кран РДК-250. 1987 г.в. | 36 948 руб. 93 коп. (369 489 276) | 1 847 руб. 45 коп. (18 474 463) |
| 6 | 453 | Экскаватор ЕК-18-20 (рег. знак КА-7 0708), 2007 г.в. | 14 909 руб. 22 коп. (149 092 164) | 745 руб. 46 коп. (7 454 608) |
| 7 | 420 | Экскаватор-погрузчик 702Е на базе Беларус 82.1 (рег. знак КА-7 0339), 2006 г.в. | 12 316 руб. 31 коп. (123 163 092) | 615 руб. 81 коп. (6 158 155) |
| 8 | 496 | Автомобиль МАЗ-5516А5-380 самосвал (рег. знак AI 8474-7), 2010 г.в. | 20 743 руб. 26 коп. (207 432 576) | 1 037 руб. 16 коп. (10 371 629) |
| 9 | 455 | Автомобиль МАЗ-544008 (рег. знак АВ 7513-7), 2007 г.в. | 13 396 руб. 69 коп. (133 966 900) | 669 руб. 83 коп. (6 698 345) |
| 10 | 497 | Автомобиль МАЗ-6422А5-320 (рег. знак AI-8373-7). 2010 г.в. | 15 125 руб. 29 коп. (151 252 920) | 756 руб. 26 коп. (7 562 646) |
| 11 | 504 | П/прицеп АПС 554422 (комп12) Y39554422A0023075 (рег. знак А 5273 А-7), 2010 г.в. | 15 773 руб. 52 коп. (157 735 188) | 788 руб. 676 коп. (7 886 759) |
| 12 | 505 | Полуприцеп МАЗ-975800-(2012) (Y3M975800A0012059) (рег. знак А 5274 А-7), 2010 г.в. | 8 426 руб. 95 коп. (84 269 484) | 421 руб. 35 коп. (4 213 474) |
| 13 | 454 | Полуприцеп МАЗ-975830 (рег. знак А 1763 А-7), 2007 г.в. | 5 401 руб. 89 коп. (54 018 900) | 270 руб. 09 коп. (2 700 945) |
| 14 | 268 | Полуприцеп ПЛ 12-12 (рег. знак 2892 АА-7), 1992 г.в. | 3 025 руб. 06 коп. (30 250 584) | 151 руб. 25 коп. (1 512 529) |
| 15 | 131 | Прицеп ПЛ-12-12 (рег. знак 2949 КА), 1992 г.в. | 3 025 руб. 06 коп. (30 250 584) | 151 руб. 25 коп. (1 512 529) |
| 16 | 702 | Автомобиль МАЗ-5432А3 шасси Y3M 5432A0001184 (рег. знак АЕ 1216-1), 2010 г.в. | 9 075 руб. 17 коп. (90 751 752) | 453 руб. 76 коп. (4 537 588) |
| 17 | 802 | Полуприцеп МАЗ-938660-(044) Y3M938660A0010402 (рег. знак А 8983 А-1), 2010 г.в. | 4 321 руб. 51 коп. (43 215 120) | 216 руб. 07 коп. (2 160 756) |
| 18 | 700 | Автомобиль МАЗ-437041 г/н 8078 АА-1 (рег. знак АА 8078-1), 2007 г.в. | 9 507 руб. 33 коп. (95 073 264) | 475 руб. 37 коп. (4 753 663) |

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375 29 654-92-93 (МТС) |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведение аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 28.06.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **23.08.2016 в 11.00 по адресу: ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, 15, 3 этаж** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **22.08.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

**Назначенный ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи» на 19.08.2016 г. пятый повторный аукцион по продаже имущества, предназначенного для производства мяса птицы и ведения товарного хозяйства, ОТМЕНЯЕТСЯ.**

УНП 600077897

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКАЯ ОБЛАСТНАЯ БАЗА «БАКАЛЕЯ»

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена без НДС, BYN | Размер задатка, BYN |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Капитальное строение (инв.№ 112/С-1087) – магазин, общ. пл. 96,6 м², сарай, уборная, забор железобетонный 123 м.п. с металлическими воротами 6 м.п. (инв. № 2502), кабельные линии электропередачи 17 м.п. (инв. № 1979), сети водоснабжения 40 м.п., газопровод 21 м.п. и оборудования: котел отопительный КСГВ 12,5 (инв. № 2402), теплосчетчик сенсоник, счетчик расхода воды ЕТК-м ДУ 15, электросчетчик ЦЭ 6822 3ф, кондиционер LG S24 LHP (инв. №2259), роллетта защитная р.1430x1780, ролллета защитная р. 1450x1780, охранно-пожарная сигнализация ALARM 4 (инв. №2396). Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 121650100001000297, пл. 0,0634 га | 33 428,48 | 1 886,64 |

| | |
|---|---|
| **Местонахождение объекта** | Брестская обл., Ганцевичский р-н, г. Ганцевичи, ул. Октябрьская, д. 69 |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ОАО «Брестская областная база «Бакалея» |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20-ти рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 24 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325. Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 23 августа 2016 г. до 17.00.**

БелВЭБ

ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
в департаменте
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
10.08.2016

УТВЕРЖДЕНО
Протоколом Наблюдательного
Совета ОАО «Банк БелВЭБ»
02.08.2016 № 25

### Изменения в Проспект эмиссии именных процентных бездокументарных облигаций второго выпуска Открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк»

1. Подпункты 2.2, 2.3 пункта 2 Проспекта эмиссии именных процентных бездокументарных облигаций второго выпуска Открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк», утвержденного протоколом Наблюдательного Совета ОАО «Белвнешэкономбанк» от 26.09.2011 №18, изложить в следующей редакции:

«**2.2. Форма выпуска и вид облигации, объем эмиссии, количество облигаций:**

Форма выпуска облигаций — бездокументарная (в виде записи на счетах).

Вид облигаций — именные процентные неконвертируемые для юридических лиц.

Объем выпуска облигаций составляет 10 000 000 (десять миллионов) белорусских рублей.

Количество облигаций — 10 000 (десять тысяч) именных процентных бездокументарных облигаций.

Номер выпуска — 2.

**2.3. Номинальная стоимость:**

Номинальная стоимость облигации — 1 000 (одна тысяча) белорусских рублей.».

Председатель Правления Н.В. Лузгин

Главный бухгалтер Л.А. Филиппова

ОАО «Банк БелВЭБ». УНП 100010078

## ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

***г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 129***

**сообщает, что 18 августа 2016 г. в 11.00 в конференц-зале акционерного общества по адресу: 220123, г. Минск, ул. М. Богдановича, 129**

**СОСТОИТСЯ ПОВТОРНОЕ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. О реорганизации ОАО «Белтрубопроводстрой» в форме выделения из него юридического лица и условиях выделения (наименование, организационно-правовая форма, состав участников, размер уставного фонда и источники его формирования, размер долей участников, юридический адрес выделяемого юридического лица).

2. О порядке выделения юридического лица из ОАО «Белтрубопроводстрой».

3. Об установлении цены выкупа акций акционеров, не участвовавших в общем собрании или голосовавших против принятия решения о реорганизации ОАО «Белтрубопроводстрой» в соответствии с п.5.9 Устава.

Собрание проводится в очной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, 11 августа 2016 года.

